

ЯК ПРЫЗНАВАЛІСЯ Ў КАХАННІ КЛАСІКІ? **11**

ЯКІЯ АЎТО КУПЛЯЮЦЬ БЕЛАРУСЫ? **15**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 САКАВІКА 2022 г. АЎТОРАК № 41 (29663)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар БРЫЛО, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«У апошнія гады ўсё часцей узнімаецца пытанне выкарыстання тэхналогій дакладнага земляробства і рэсурсазберагальных тэхналогій. У Беларусі ўкараняюцца элементы сістэмы дакладнага земляробства (сістэмы паралельнага ваджэння, GPS-навігацыі, сістэмы ўліку расходу паліва). У 2021 годзе вясновая сяўба яравых збожжавых і зернебабовых культур з выкарыстаннем элементаў сістэмы дакладнага земляробства праведзена на 16 працэнтах плошчы, сяўба азімых збожжавых на зерне — на 10 працэнтах. Летась распрацавана канцэпцыя лічбавай платформы «Дакладнае земляробства», мэтай стварэння якой з'яўляецца інфармацыйнае суправаджэнне, планаванне і вядзенне гаспадарчай дзейнасці на аснове апаратыўнага кіравання тэхналагічнымі працэсамі ў раслінаводстве».*

## КОРАТКА

- **Знешні дзярждоўг Беларусі ў студзені зменшыўся на 1,6 працэнта, да $17,9 млрд.**
- Серыю паштовак з пасланнямі нашчадкам ад жанчын-ветэранаў ствараюць у Гродзенскай вобласці.
- **Дзень посткросера праходзіць 1 сакавіка ва ўсіх аддзяленнях «Белпошты».**
- У Баранавічах у двары дома адкапалі 26 снарадаў часоў вайны.
- **Адборачныя матчы чэмпіянату Еўропы паміж гандбалісткамі Беларусі і Грэцыі адменены.**





# ВЫБАР ЗРОБЛЕНЫ

### Змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю падтрымалі 82,86 % грамадзян, з тых, што прыйшлі на рэферэндум

**Папярэднія вынікі рэспубліканскага рэферэндуму падчас прэс-канферэнцыі агучыў старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Ігар КАРПЕНКА.**

— У адпаведнасці з артыкулам 121 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь, рашэнне аб змяненнях і дапаўненнях у Канстытуцыю лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала большасць грамадзян, унесеных у спісы для галасавання, — акцэнтаваў увагу кіраўнік Цэнтрвыбаркама. — Агульная колькасць грамадзян, унесеных у спісы ўдзельнікаў рэферэндуму, склала 6 мільёнаў 815 тысяч 667 чалавек. У галасаванні прыняло ўдзел 5 мільёнаў 359 тысяч 471 грамадзянін, або 78,63 % (гэта значыць, больш чым палова ад унесеных у спісы). Такім чынам, рэспубліканскі рэферэндум адбыўся.

За прынясце змяненняў і дапаўненняў да Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь прагаласавалі 4 мільёны 440 тысяч 813 грамадзян, што склала 82,86 % ад колькасці тых, хто прагаласаваў, або 65,16 % ад унесеных у спісы для галасавання. Супраць прыняцця змяненняў і дапаўненняў прагаласавала 686 тысяч 165 удзельнікаў рэферэндуму, што складае 12,8 % ад тых, хто прагаласаваў, або 10,07 % ад унесеных у спісы для галасавання. Як паведамілі ў Цэнтральнай камісіі, канчатковыя вынікі рэферэндуму будуць падведзены 3 сакавіка.

Ігар Карпенка адзначыў, што яўка на рэферэндум была дастаткова добрай. Для параўнання ён прывёў вынікі яўкі трох мінулых рэферэндумаў, праведзеных у Беларусі. У 1995 годзе свае галасы аддалі амаль 65 % грамадзян, у 1996-м — звыш 84 %, у 2004 — больш за 90 % беларусаў. **СТАР. 2**

# ВЯСНА. ХУТКА СЕЯЦЬ



Фота Віктара ДРАЧОВА.

**Нягледзячы на тое, што па начах на Палессі яшчэ нярэдкія замаразкі, механізатары адной з найлепшых гаспадарак Гомельскай вобласці — ААТ «Тураўшчына» ўжо практычна падрыхтавалі тэхніку да веснавых палявых работ. На механізаваным аддзяленні ў аграгарадку Верасніца трактарысты, зваршчыкі і слесары-зборшчыкі працуюць над тым, каб падчас сяўбы не было ніякіх збояў у рабоце.**

**Трактарыст Аляксандр БЛОЦКІ, які працуе ў гаспадарцы ўжо 26 гадоў, добра ведае, як важна, каб уся тэхніка была дагледжана і адрамантавана.**

У сезон

# КАБ УРАДЖАЙ УРАДЗІЎ

## Новыя сарты і падыходы ў агародніцтве

**Напярэдадні новага дачнага сезона размаўляем з дырэктарам РУП «Інстытут агародніцтва», кандыдатам сельскагаспадарчых навук Андрэем ЧАЙКОЎСКІМ аб новых сартах і гібрыдах агародніны айчыннай селекцыі, глабальным пацяпленні і пра тое, што сёння рэальна вырасціць на сваіх «сотках».** **СТАР. 13**



ISSN 1990 — 763X

# ВЫБАР ЗРОБЛЕНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

За правядзеннем рэферэндуму назірала 195 міжнародных і 45 тысяч 701 нацыянальны назіральнік. «У ЦВК ад назіральнікаў не паступала інфармацыі аб парушэннях заканадаўства аб рэферэндуме, — паведаміў старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў. — Мы чакаем канчатковых заяў ад назіральных місій па выніках іх работы, маніторынгу падрыхтоўкі і правядзення рэспубліканскага рэферэндуму».

Па словах Ігара Карпенкі, за перыяд падрыхтоўкі і правядзення рэферэндуму ў Цэнтрвыбаркам паступіла каля 700 зваротаў грамадзян. «Асноўная маса зваротаў датычылася ўдакладнення звестак у спісах удзельнікаў рэферэндуму, магчымасці прагаласаваць не па месцы рэгістрацыі, пераліку дакументаў, па якім можна было атрымаць бюлетэнь для галасавання, — удакладніў ён. — Усе пытанні вырашаліся аператыўна, грамадзянам былі дадзены тлумачэнні, аказана неабходная дапамога».

У ходзе рэферэндуму былі зафіксаваныя некаторыя правакацыі і спробы перашкодзіць яго правядзенню. «У асноўны дзень



Фота БелТА.

правядзення рэферэндуму асобныя дэструктыўныя тэлеграм-каналы сталі распаўсюджваць інфармацыю з заклікамі сарваць рэферэндум, знішчаць бюлетэні, выходзіць на ўсялякага роду незаконныя акцыі, мітынгі і пікеты, — заўважыў кіраўнік Цэнтрвыбаркама. — Акрамя таго, паступалі пагрозы ў адносінах да членаў камісій. Нягледзячы на ўсе спробы дэструктыўных сіл і дзякуючы зладжанаму механізму ўзаемадзеяння ўсіх зацікаўленых асоб, рэспубліканскі рэферэндум быў праведзены ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам і без пэўных здарэнняў».

— Пасля падвядзення вынікаў трэба яшчэ раз уважліва прааналізаваць ход гэтай электаральнай кампаніі, паглядзець на ўсе пытанні, якія не знаходзілі поўнага адлюстравання ў нашым заканадаўстве, і прыступіць да падрыхтоўкі змяненняў і дапаўненняў, у першую чаргу, у Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, — расказаў кіраўнік ЦВКа аб найбліжэйшых планах.

Ігар Карпенка падзякаваў усім грамадзянам, якія прынялі ўдзел у рэспубліканскім рэферэндуме, праявілі сваю грамадзянскую пазіцыю. Асаблівыя словы ўдзячнасці ён адрасаваў членам камісій па рэферэндуме, прадстаўнікам праваахоўных органаў, ратавальнікам, урачам, якія забяспечвалі бяспеку падчас правядзення рэферэндуму, а таксама шматлікім назіральнікам і сродкам масавай інфармацыі, якія асвятлялі найважнейшую грамадска-палітычную падзею краіны.

**Вераніка КАНЮТА.**

### У тэму

Як паведамілі ў Міністэрстве ўнутраных спраў, дэстабілізацыі абстаноўкі ў краіне падчас рэферэндуму не дапушчана. МУС былі прыняты неабходныя меры па падтрыманні парадку ў краіне і забеспячэнні грамадскай бяспекі ў перыяд правядзення рэспубліканскага рэферэндуму. Нягледзячы на шматлікія заклікі ад дэструктыўных тэлеграм-каналаў да дэстабілізацыі абстаноўкі, якія распаўсюджваліся грамадзянамі, што знаходзяцца за межамі краіны, масавасці пратэсных акцый не атрымалася. Супрацоўнікі міліцыі былі арыентаваны на аператыўнае рэагаванне і спыненне правакацый. Па фактах заклікаў грамадзян да ўчынення дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, а таксама арганізацыі масавых несанкцыянаваных акцый узбуджана крымінальная справа. Устаноўлены і затрыманы асобы, якія маюць да гэтага дачыненне. За розныя парушэнні грамадскага парадку па краіне затрымана каля 800 чалавек. У цяперашні час праводзіцца праверка для дачы прававой ацэнкі іх дзеянням. Некаторыя з іх ужо раней прыцягваліся да адказнасці за падобныя правапарушэнні. Акрамя таго, зарэгістраваны матэрыялы па фактах незаконнай падачы гукавых сігналаў, праводзіцца работа па ўстанаўленні такіх кіроўцаў. МУС выказвае ўдзячнасць законапаслухмяным грамадзянам, якія не паддаліся на правакацыі і дапамагалі праваахоўнікам у забеспячэнні грамадскага парадку.

# ВЫСОКІ АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ЎЗРОВЕНЬ ПЛЮС ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ УДЗЕЛЬНІКАЎ

## Назіральнікі пра рэферэндум

**Прадстаўнікі місій назіральнікаў на рэспубліканскім рэферэндуме па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю падзяліліся сваімі ўражаннямі ад работы на рэферэндуме.**

**Кіраўнік місіі назіральнікаў ад СНД, намеснік старшыні Выканаўчага камітэта — Выканаўчага сакратара СНД Ільхом НЕМАТАЎ** падкрэсліў высокі арганізацыйны ўзровень рэферэндуму. Па яго словах, доўгатэрміновыя назіральнікі працавалі ў Беларусі з 1 лютага. Яны наведалі практычна ўсе рэгіёны краіны, дзе сустракаліся са старшынямі тэрытарыяльных участковых камісій, знаёміліся з метадычнымі і інфармацыйнымі матэрыяламі, са спісамі ўдзельнікаў і іншымі неабходнымі прававымі дакументамі. У асноўны дзень галасавання 27 лютага яны наведалі 926 участкаў па ўсёй краіне, з іх — сем у Мінску.

«Мы былі прыемна здзіўлены, што ўсюды была арганізавана работа аб'ектаў гандлю, культурная праграма, што стварала спрыяльныя ўмовы і добры святочны настрой для грамадзян. Мы ўпэўніліся ў актыўнасці беларусаў, якія галасавалі з самай раніцы. Многія прыходзілі з дзецьмі, як на свята. Беларусы разумеюць, што любая Канстытуцыя павінна быць адаптавана да рэалій, якія сёння адбываюцца не толькі ў краіне, але і ва ўсім свеце, тады Асноўны Закон будзе працаваць», — адзначыў Ільхом Нематаў.

Словы свайго калегі пацвердзіў і **Канстанцін КАСАЧОЎ, каардынатар назіральнікаў ад Міжпарламенцкай Асамблеі СНД.** Ён расказаў, што падчас наведвання ўчасткаў шмат размаўляў з людзьмі. У размовах з імі ён пераканаўся, што сэнс змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю беларусы разумеюць. Асобна Канстанцін Касачоў падкрэсліў папярэднюю работу па інфармаванні насельніцтва, абмеркаванне праекта Канстытуцыі было арганізавана галосна і дэмакратычна. «Любы грамадзянін Беларусі мог атрымаць вычарпальныя адказы на ўсе свае пытанні. Тым не менш, калі ў кагосьці не хапіла часу, каб разабрацца ў сутнасці, дадатковыя магчымасці былі створаны на ўсіх без выключэння ўчастках, якія мы наведалі. Можна было азнаёміцца з тэкстамі прапанаваных навел і дзейнай рэдакцыі Асноўнага Закона, была магчымасць атрымаць кансультацыі ў спецыялістаў», — канстатаваў ён. Высока ацаніў ён і работу назіральнікаў, акрэдытаваных беларускім бокам.

«У асобных выпадках нашы назіральнікі фіксавалі пэўныя недапрацоўкі тэхнічнага характару. Самай сур'ёзнай з іх была адсутнасць на некаторых участках пандусаў для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Аднак ні адна з гэтых хібнасцяў не магла паўплываць на вынік галасавання. Рэферэндум прайшоў з выкананнем правоў і свабод удзельнікаў найважнейшай грамадска-палітычнай падзеі ў жыцці краіны, адпавядаў заканадаўству і міжнародным абавязацельствам Беларусі ў электаральнай сферы», — заявіў Канстанцін Касачоў.

**Міжнародны назіральнік Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва Казыбек КАЧКОНАЎ** адзначыў высокі ўзровень вядзення працэдур галасавання членамі камісій. Таксама назіральнікі місіі падкрэслілі высокі ўзровень зацікаўленасці грамадзян, якія ўдзельнічалі ў галасаванні. Казыбек Качконаў расказаў, што ў міжнародную назіральную місію ШАС не паступіла заўваг па правядзенні рэферэндуму.

«Запрашэнне міжнародных назіральнікаў расцэньваецца місіяй як імкненне забяспечыць адкрытасць і празрыстасць рэферэндуму. У складзе місіі Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь было акрэдытавана 14 назіральнікаў. Гэта былі прадстаўнікі заканадаўчых і выбарчых органаў, дыпламаты дзяржаў — членаў ШАС і службовыя асобы Выканаўчага камітэта Рэгіянальнай антытэрарыстычнай структуры. Місія выконвала сваю функцыю, кіруючыся Палажэннем аб місіі назіральнікаў ад ШАС на прэзідэнцкіх або парламенцкіх выбарах, а таксама рэферэндумах. Намі былі выкананы прынцыпы палітычнай нейтральнасці, аб'ектыўнасці, неўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржавы і заканадаўства Рэспублікі Беларусь», — расказаў Казыбек Качконаў. Таксама ён падкрэсліў, што правядзенне рэферэндуму суправаджалася комплексным прымяненнем розных інфармацыйных тэхналогій, якія садзейнічалі захаванню галоснасці, празрыстасці і выключэнню ўплыву адміністрацыйнага рэсурсу.

### Мы ўсе спрацавалі вельмі зладжана

З пачатку датэрміновага галасавання ў штаб-кватэры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі працаваў грамадскі інфармацыйны цэнтр, у якім акумуляваліся інфармацыя ад назіральнікаў з усіх рэгіёнаў. Увесь час спецыялісты цэнтра трымалі сувязь з назіральнікамі на ўчастках па ўсёй краіне. Гэта дазволіла сабраць поўную і аб'ектыўную карціну арганізацыі і правядзення рэферэндуму і ходу галасавання з першай і да апошняй хвіліны.

**Старшыня Беларускай федэрацыі прафсаюзаў Міхаіл ОРДА** падкрэсліў, што з першага дня датэрміновага галасавання назіральнікі фіксавалі актыўную яўку ва ўсіх рэгіёнах краіны. Паводле яго слоў, гэта пацвярджэнне таго, што ва ўсёй краіне людзі ведаюць і разумеюць, якія змяненні і дапаўненні ўносяцца ў Канстытуцыю.

Міхаіл Орда даў высокую адзнаку работы камісій: «Прычапіцца ў іх рабоце практычна няма да чаго. Парушэнняў, якія маглі б паўплываць на ход і вынікі галасавання, не выяўлена ў прынцыпе. Члены камісій прыслухоўваліся да ўсіх прапаноў, якія выказвалі назіральнікі для паляпшэння ўмоў галасавання на ўчастку, і прымалі неабходныя меры, уважліва разглядалі ўсе пытанні грамадзян. Мы спрацавалі вельмі зладжана, не было падзелу або закрытасці. Аб усіх нашых назіраннях мы расказвалі. Як мы і заяўлялі, гэта рабілася для сумлення, аб'ектыўнага назірання, каб ведаць, што адбываецца на месцах, і далейшага інфармавання грамадства і свету».

Назіральнікі зафіксавалі каля дзесяці скаргаў ад удзельнікаў рэферэндуму, пададзеных у камісіі. Міхаіл Орда падкрэсліў, што ў большасці выпадкаў іх цяжка назваць аб'ектыўнымі. Напрыклад, людзі скардзіліся на маленькія памяшканні для галасавання, на адсутнасць стала для напісання скаргаў ці адсутнасць шторкі. Было зафіксавана некалькі выпадкаў, калі ўдзельнікі рэферэндуму абражалі ці пагражалі членам камісій. Міхаіл Орда расказаў, што мелі месца і правакацыі: «На адным з участкаў грамадзянін спрабаваў замяніць афіцыйны бюлетэнь на загадзя парыхтаваны падробленны і збіраўся кінуць яго ў скрыню. Пільныя назіральнікі не дазволілі і выклікалі міліцыю». Не абышлося і без нагод для гумару. У Мінску жанчына ад хвалявання ці выпадкова кінула ў скрыню разам з бюлетэнем і свой пашпарт. Дакумент жанчыне вярнулі ў панядзелак.

Актыўны ўдзел у канстытуцыйным рэферэндуме прыняла і беларуская моладзь. Пра гэта расказаў **першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ.** Маладыя людзі таксама актыўна працавалі ва ўчастковых камісіях і валанцёрамі. Больш за 5200 чалавек працавалі ў якасці нацыянальных назіральнікаў. Напярэдадні рэферэндуму БРСМ разам з цэнтральнай выбарчай камісіяй і ўніверсітэтам інфарматыкі і радыёэлектронікі распрацавалі мабільны дадатак «Твой участак». З яго дапамогай удзельнікі рэферэндуму маглі скласці маршрут да месца для галасавання, азнаёміцца з праектам абноўленай Канстытуцыі і паглядзець кантакты ўчастковай камісіі.

«Дадатак добра сябе паказаў, быў эфектыўны. Аднак былі зафіксаваны кібератакі з заходняга боку, якія, на жаль, атакавалі гэты рэсурс і заблакіравалі. Пацярпелі ад блакіроўкі і сацыяльных сетак БРСМ у рэгіёнах. Пра гэта важна казаць, сітуацыя была абвостраная. Але трэба аддаць належнае моладзі: на маніпуляцыі ў лічбавай прасторы не паддаваліся і адпрацавалі на выдатна», — расказаў Аляксандр Лук'янаў.

Назіральнікі аднагалосна сышліся ў меркаванні, што рэспубліканскі рэферэндум па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю стаў сапраўдным святам для ўсёй краіны. І разам з тым прайшоў у адпаведнасці з нацыянальным і міжнародным заканадаўствам. І, як адзначыла **старшыня камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, лідар Беларускага саюза жанчын Алена БОГДАН,** гэта быў выбар народа. Самае галоўнае, што захавалася пераемнасць пакаленняў, калі старэйшыя дэманструюць дзецям, унукам прыклад праявы актыўнай грамадзянскай пазіцыі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### Тым часам

Кітай паважае і цвёрда падтрымлівае беларускі народ у выбары шляху развіцця. Аб гэтым заявіў афіцыйны прадстаўнік Міністэрства замежных спраў Кітайскай Народнай Рэспублікі Ван Вэньбінь, каментуючы папярэднія вынікі праведзенага 27 лютага ў Рэспубліцы Беларусь рэферэндуму па канстытуцыйных папраўках, паведамляе БелТА.

«Мы адзначылі паспяховае правядзенне беларускага рэферэндуму па папраўках да Канстытуцыі», — сказаў Ван Вэньбінь.

«Кітай і Беларусь з'яўляюцца ўсёабдымнымі стратэгічнымі партнёрамі. Кітай паважае і цвёрда падтрымлівае беларускі народ у выбары шляху развіцця, які адпавядае яго ўласным нацыянальным умовам, і верыць, што Рэспубліка Беларусь прадоўжыць падтрымліваць добрую дынаміку стабільнасці і развіцця», — падкрэсліў афіцыйны прадстаўнік знешнепалітычнага ведамства КНР.

Фінансы

## СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ ПАВЫШАЕЦЦА ДА 12 % ГАДАВЫХ

**Праўленнем Нацыянальнага банка прынята рашэнне павысіць з 1 сакавіка гэтага года стаўку рэфінансавання да 12 % гадавых, стаўку па крэдыце авернайт — да 13 % гадавых, стаўку па дэпазіце авернайт — да 11 % гадавых.**

Прынятае рашэнне накіравана на падтрыманне фінансавай стабільнасці і абмежаванне інфляцыі, рызыкі паскарэння якой узраслі на фоне рэзкага абвастрэння геапалітычнай сітуацыі і прынятых шэрагам заходніх краін санкцый у дачыненні да Расійскай Федэрацыі — асноўнага эканамічнага партнёра Беларусі.

У далейшым Нацыянальны банк працягне прымаць неабходныя меры па забеспячэнні фінансавай і цэнавай стабільнасці з улікам развіцця знешнепалітычнай сітуацыі, абапіраючыся на бесперапынны маніторынг тэндэнцый на валютным і дэпазітным рынках і ацэнку інфляцыйных рызык, падкрэслілі ў галоўным банку краіны.

## СЁННЯ ГАЛОЎНАЕ — ЗАХАВАЦЬ НА НАЛЕЖНЫМ УЗРОЎНІ ПАКУПНІЦКУЮ ЗДОЛЬНАСЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ВАЛЮТЫ

**Банкаўскі сектар Беларусі стабільна функцыянуе і валодае дастатковым запасам трываласці для выканання ўсіх задач ва ўмовах узмацнення геапалітычнай напружанасці і пашырэння санкцыйнага ціску з боку шэрагу дзяржаў, лічыць упраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка краіны.**

Разам з тым, галоўны банк прагназуе розныя варыянты развіцця сітуацыі. Цяпер эксперты гэтага фінансавага інстытута сумесна са спецыялістамі іншых банкаў краіны выпрацавалі адэкватныя меры рэагавання на патэнцыяльныя рызыкі.

У цяперашні час забяспечваецца ўстойлівае функцыянаванне беларускіх банкаў, бесперапыннасць іх дзейнасці па аказанні банкаўскіх паслуг і выкананне імі ў поўным аб'ёме абавязацельстваў перад укладчыкамі і крэдыторамі.

Са свайго боку, Нацыянальны банк працягвае ажыццяўляць маніторынг бягучай сітуацыі і гатовы прыняць неабходныя меры для забеспячэння фінансавай стабільнасці.

У заяве прэс-службы падкрэсліваецца, што ключавой макраэканамічнай задачай для Нацыянальнага банка застаецца захаванне пакупніцкай здольнасці нацыянальнай валюты. А ўзровень працэнтных ставак па ўкладах у беларускіх рублях забяспечвае захаванасць зберажэнняў. Ваганні курса беларускага рубля абумоўлены дынамікай курсаў валют асноўных гандлёвых партнёраў Беларусі. Нацыянальны банк працягвае рэалізацыю курсавой палітыкі ў рэжыме плаваючага курса, згладжваючы рэзкія ваганні курса беларускага рубля без процідзеяння глабальным трэндам.

Варта адзначыць, што, нягледзячы на працяглую санкцыйную рыторыку, плацежны баланс краіны па-ранейшаму застаецца дадатным. Прыток валюты ў краіну ад знешнеэканамічнай дзейнасці дастатковы і дазваляе забяспечыць знешнія абавязацельствы і задаволіць патрэбы эканомікі і насельніцтва ў валюце, упэўнены ў Нацбанку.

**Сяргей КУРКАЧ.**

На слыху

# ЗА СТАЛОМ ПЕРАГАВОРАЎ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка напярэдадні правёў серыю кантактаў на найвышэйшым узроўні па арганізацыі ў Беларусі мірных расійска-ўкраінскіх перагавораў. Аб гэтым інфармуе прэс-служба беларускага лідара.**

Кіраўнік беларускай дзяржавы патэлефанаваў Прэзідэнту Украіны Уладзіміру Зяленскаму. Палітыкі дамовіліся, што ўкраінская дэлегацыя сустрэнецца з расійскай без папярэдніх умоў на ўкраінска-беларускай граніцы ў раёне ракі Прыпяць.

Прэзідэнт Беларусі ўзяў на сябе адказнасць за тое, што на час праезду, перагавораў і вяртання ўкраінскай дэлегацыі ўсе самалёты, верталёты і ракеты, размешчаныя на беларускай тэрыторыі, застануцца на зямлі.

Пасля размовы з Прэзідэнтам Украіны Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да Прэзідэнта Расіі з прапановай расійскай дэлегацыі, якая прыбыла ў Гомель для ўдзелу ў мірных перагаворах, затрымацца і перанесці перагаворы на крыху пазнейшы час у сувязі з затрымкай дэлегацыі з Украіны. Уладзімір Пуцін прапанову беларускага калегі падтрымаў.

Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў, што самае небяспечнае, эскалацыя канфлікту, яшчэ наперадзе. Могуць паўтарыцца югаслаўскія падзеі, і важна не дапусціць гэтага. Дапамагчы могуць толькі перагаворы, перакананы беларускі лідар. «І калі ў іх (у кіраўніцтва Украіны. — **Рэд.**) ёсць хоць крыху адказнасці за свой народ, калі яны не хочуць страціць дзяржаву і дзяржаўнасць, трэба сесці за стол перагавораў і вырашыць тыя пытанні, якія сёння няхай нават выстаўляе Расія», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў журналістам пасля галасавання на рэферэндуме па абноўленай Канстытуцыі.

Расійская і ўкраінская дэлегацыі ўчора правялі свае першыя перагаворы. Сустрэча бакоў праходзіла ў Гомельскай вобласці на беразе Прыпяці. З-за меркаванняў бяспекі дакладнае месца перагавораў не называлася. Расійскую дэлегацыю на перагаворах узначаліў памочнік Прэзідэнта Уладзімір Мядзінскі. У яе склад таксама ўвайшлі намеснік міністра абароны, намеснік міністра замежных спраў Андрэй Рудэнка, старшыня камітэта Дзяржаўнай Думы па міжнародных справах Леанід Слуцкі і пасол Расіі ў Беларусі Барыс Грызлоў. Украінскі бок прадстаўлялі намеснік кіраўніка МЗС Мікалай Тачыцкі, міністр абароны Аляксей Рэзнікаў, саветнік кіраўніка Офіса прэзідэнта Міхаіл Падаляк, кіраўнік фракцыі «Слуга народа» Давід Арахамія, народны дэпутат Рустэм Умераў і першы намеснік кіраўніка ўкраінскай дэлегацыі ў трохбаковай кантактнай групе Андрэй Косцін.

Расійскі бок прыбыў у Беларусь яшчэ 27 лютага. Украінская дэлегацыя прыляцела на ваенных верталётах да месца перагавораў учора крыху менш як за дзве гадзіны да іх пачатку. Асноўныя патрабаванні ўкраінскага боку — вывад расійскіх войскаў з Украіны і спыненне агню. Аб гэтым заявіў журналістам саветнік кіраўніка Офіса прэзідэнта Украіны Аляксей Арастовіч. Расійская дэлегацыя ўздымала падчас абмеркавання пытанні міру. Аб адпаведным намеры сказаў напярэдадні намеснік міністра замежных спраў РФ Андрэй Рудэнка. «У першую чаргу будзем размаўляць аб міры, якім чынам ва Украіну можа прыйсці мір, што трэба для гэтага зрабіць, каб не паўтарыліся ўсе тыя падзеі, сведкамі якіх мы былі ў 2014 годзе», — заявіў журналістам прадстаўнік расійскай дэлегацыі. Паводле яго слоў, галоўнай умовай Расіі стане выкананне патрабаванняў аб дэмілітарызацыі і дэнацыфікацыі Украіны.

«Паважаныя сябры, Прэзідэнт Беларусі прасіў сустрэць вас, вітаць і забяспечыць максімальна вашу работу. Як было дагаворана з прэзідэнтамі Зяленскім і Пуціным, вы можаце адчуваць сябе ў поўнай бяспецы. Гэта наш святы абавязак», — заўважыў міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей перад пачаткам сустрэчы, паведаміла БелТА. Як адзначыў кіраўнік МЗС, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка спадзяецца, што падчас расійска-ўкраінскіх перагавораў на Прыпяці ўдасца знайсці шляхі вырашэння крызісных пытанняў.

**Пётр ДУНЬКО.**

Па сутнасці

# Час сеяць праўду



**Калі чалавек ашуквае мяне адзін раз — хай будзе сорамна яму, калі ён ашуквае мяне другі раз — хай будзе сорамна мне (Стывен Кінг). На кіеўскай вуліцы Банкаўская, здаецца, сораму няма. Як і прадказальных дзеянняў. Добра, што ёсць Беларусь. Можам дапамагчы ў пошуках будучыні.**

Я спецыяльна прывёў цытату заходняга «экспЭрта». Бо ўсе іх філасофіі і тэорыі залатога мільярда, стаўленне да бессаратных людзей ужо даўно ў нашых мазгах і нашых сэрцах. Гуляюць па сваіх правілах на нашым полі. І не толькі медыйным. Але беларусы пакуль яшчэ не здалі Бацькава поле. Не далі засеяць пустазеллем. За тое нас і дзяўбуць.

Мы правялі рэферэндум. Маўчанне. А як жа. У іх рэферэндумы не пагражаюць. У іх ладзяць фікцыю дэмакратыі. Нават пра скандальна вядомага Чэчку пісаць у заходніх краінах нельга. Добра ці дрэнна пісаць. Наогул ніяк нельга. Штраф.

Вы думаеце, калектыўны Захад цікавіць, ці ўлічылі ваша меркаванне? Іх нават не цікавіць меркаванне ўласных народаў. Маскавы генацыд гэта паказаў. Гета стварылі нават не патаціўшыся на калючы дрот. А ўся гэтая ковідная істэрыка паказала нашу ўразлівасць і кіравальнасць. Забыліся ўжо і не кідаемся адзін на аднаго — безмаскавыя. А як у жніўні перагрэліся ад пякельнага полымя хлусні... Добра, хоць астудзілі нашы галовы.

Зразумела, мы ж раней прывыклі крытыкаваць толькі навіны пра пасяўную. А тут такое. У крэматорыях спальваюць людзей з Акрэсціна. Ну верылі ж. Як зараз верыце фэйкам з Украіны. Нічога не памянялася. Але рэальнасць — іншая. На змену гару майданных пакрышак — гар адэскай трагедыі. Хатыні XXI стагоддзя. Палац прафсаюзаў і стаў тым самым сапраўдным крэматорыем — сімвалам «рэвалюцыі гіднасці».

Не перакручвай, скажуць. Скажыце гэта радні загінулай горлаўскай мадонны і яшчэ 15 тысяч забітых на Данбасе. Скажыце гэта закатаваным у засценках СБУ. Змагароў і майданутых біць дубінкамі нельга — Гаага. А па-зверску знішчаць рускамоўных і па-славянску думаючых — можна. Ватнікі ж. Нацызм. І не трэба зараз моршчыцца ад бандэраўцаў. Усё пачынаецца ад маршаў з бчб-сцягамі і плачам па сініх нагах. А заканчваецца фосфарнымі бомбамі ў спальных кварталах.

Ёсць іншы свет. Мінскі. Беларускі. Палацавы. Не. Не па сцэнарыі заўсёднікаў Букінгемскага палаца. Па прыкладзе Палаца Незалежнасці ў Мінску. Дык і незалежнасць захаваць можна. Рэальны суверэнітэт. Без палацавых пераваротаў. Але сустракацца трэба без заморскіх прадзюсараў. Зразумела, Зяленскаму гэта складана зрабіць. Прывык па сцэнарыі працаваць. Час ужо пераходзіць і да імправізацыі. Улічваць новыя абставіны.

Зяленскі імправізуе. Нават часам занадта часта. Не, так. Ды не. Не так. Пакуль набіраліся гэтыя радкі, перагаворы пачаліся. Нягледзячы на пыху Кіева. Лукашэнка пераканаў прыехаць у Беларусь. Упрасіў. Цяпер беларусы дакладна ўдзельнічаюць у гэтым канфлікце. У якасці міратворцаў. Нездарма ж Аляксандра Лукашэнку ў «міратворцы» запісалі. Кніга ў іх такая ёсць. Падтэкст, вядома ж, іншы. А зараз сапраўды. Зноў — міратворац. Гістарычная сустрэча на Эльбе была сяброўскай. Учарашняя сустрэча на Прыпяці — абнадзейлівая.

І зноў абралі найлепшы з магчымых варыянтаў. Абменьвацца меркаваннямі, а не ракетна-бомбавымі ўдарамі. Раней, дарэчы, па Прыпяці ляталі ракеты. Катары так называліся. Ці вернемся да такіх «ракет»? Гэта ўжо няхай рускія і ўкраінцы дамаўляюцца. Мы толькі зрабілі ўсё, каб такая неабходная сустрэча адбылася.

Нас крытыкуюць: пасееш — вецер, пажнеш — буру. Ну, ведаеце. Вятры нараджаюцца ў морах. Паўночнаатлантычныя вятры калісьці насамрэч «Буры ў пустыні» прынеслі. Гэта з амерыканскіх войн.

А мы? Так! Жаць умеем. І сеяць. У сэнсе — працаваць на зямлі. Засумавалі ўжо па сяўбе? Будзе яна абавязкова. А калі запросяць, то і на палетках украінскага Палесся. Мы пустазеллем засяваць іх землі не будзем. Не ўмеем.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Кошт нафты зноў перавысіў $100 за барэль



Кошт красавіцкага ф'ючарса на нафту маркі Brent учора на адкрыцці таргоў на лонданскай біржы ICE павялічыўся на 3,9 працэнта, да $102,32 за барэль, паведаміла РБК. Кантракт на нафту маркі WTI з пастаўкай у красавіку ўзрос на 5,49 працэнта — да $96,62. 24 лютага нафта маркі Brent узлятела на 8,4 % і перавысіла ўзровень $105 за барэль упершыню з красавіка 2014 года. Аднак ужо на наступны дзень па выніках гандлёвай сесіі кошт сыравіны склаў $98,4 за барэль. «Сітуацыя на рынку нафты і без палітыкі складалася не лепшым чынам для спажыўцоў. Сусветныя запасы скарацілся да мінімуму. На рынку захоўваецца дэфіцыт, і краіны АПЕК+ дэманструюць адсутнасць магчымасці падтрымліваць мэтавы ўзровень здабычы з-за неінвеставання ў мінулыя гады і тэхналагічных складанасцяў», — заўважыў эксперт «БКС Экспрэс» Ігар Галактыёнаў. На яго думку, зняцце санкцый з іранскага экспарту можа стаць аблягчэннем для рынку, павялічыўшы прапанову да мільёна барэляў у суткі да канца 2022 года.

### Кітайская ракета вывела ў космас адразу 22 спадарожнікі

У Кітаі з дапамогай ракеты-носьбіта «Чанчжэн-8» (Long March-8) запусцілі 22 спадарожнікі. Такім чынам быў пабіты айчынны рэкорд па колькасці касмічных апаратаў, запушчаных з дапамогай адной ракеты-носьбіта, паведаміла «Жэньмінь жыбаа» анлайн». «Чанчжэн-8» стартавала з касмадрома Вэньчан у паўднёвай правінцыі Хайнань, і ўсе спадарожнікі былі выведзены на зададзеныя арбіты. Яны будуць выкарыстоўвацца ў асноўным для аказання камерцыйных паслуг у такіх сферах, як дыстанцыйнае зандзіраванне, маніторынг марскога асяроддзя, прадухіленне лясных пажараў і змяншэнне наступстваў стыхійных бедстваў.

### Імунолаг спрагназаваў стабілізацыю захваральнасці COVID-19 да мая

Гэта адбудзецца ў тым выпадку, калі не з'явіцца новы штам каранавіруса. Такое меркаванне выказаў гендырэктар кампаніі па рэгістрацыі і даследаваннях лекавых прэпаратаў «Клінікал Экселанс Груп», імунолаг Мікалай Кручкоў, паведаміла газета «Известия». «У Даніі субліні́я мікрону — BA.2 — справакавала магутную ўспышку захворвання. У іншых краінах мы не бачым, каб BA.2 выклікаў вялікі рост захворвання. Мяркую, што ўспышак, хутчэй за ўсё, удасца пазбегнуць», — сказаў эксперт. Расія цалкам прайшла пік па амікроне на мінулым тыдні. Рост захваральнасці магчымы толькі ў выпадку з'яўлення новых варыянтаў штамаў у іншых ліній, напрыклад, «дэльты», але пакуль немагчыма прадказаць, ці ўзнікнуць яны, лічыць спецыяліст. Пры гэтым з'яўленне новага варыянта каранавіруса ўслед за «амікронам» малаверагодна, паколькі ў насельніцтва свету ўжо дастаткова высокі ўзровень калектыўнага імунітэту, адзначыў вірусолаг, прафесар вірусалогіі Інстытута імя Гамалеі Анатоль Альтштэйн.

Год гістарычнай памяці

# ВАЙНА І ЛЮБОЎ

**Адкрыццё экспазіцыі франтавых лістоў з такой назвай адбылося ў Мінскім абласным краязнаўчым музеі ў Маладзечне.**

У канцэпцыю праекта, які распрацавалі гісторыкі БДУ, закладзена ідэя аб перамозе любові і надзеі ў самых цяжкіх жыццёвых сітуацыях, момантаў роспачы і ўсеагульнага болю. Пацвярджэннем служаць гісторыі салдат і мірных жыхароў часоў Вялікай Айчыннай вайны, якія нават у гады выпрабаванняў спрабавалі будаваць адносіны, не страчваць сувязі з блізкімі і роднымі, пісалі лісты, адзначалі святы і будавалі планы на будучыню, паведамляе прэс-служба БДУ адносна канцэпцыі праекта.



Фота з сайта bsu.by

Сюжэт выставы засноўваецца на гісторыі лёсу сям'і знакамітага беларускага архітэктара Леаніда Левіна. Ён разам са сваімі блізкімі перажыў усе жахі таго часу, але здолеў захаваць светлыя пачуцці. Падзеленыя адлегласцю і нягодамі родныя людзі размаўлялі праз лісты, у якіх расказвалі пра будні на фронце і тыле, дзяліліся думкамі і надзеямі.

На 12 тэматычных стэндах прадстаўлены кранальныя радкі, фатаграфіі і паштоўкі сям'і Левіна. Гэты ўнікальны матэрыял знаёміць з дзівосным чалавекам, аўтарам вядомых сёння мемарыяльных комплексаў «Хатынь» (1969), «Яма», вязням гета ў Слуцку, «Шунеўка (Праклён фашызму)», помніка ў гонар загінулых у гады вайны студэнтаў і выкладчыкаў БДУ, які знаходзіцца ва ўніверсітэцкім дворыку.

Выстаўка падрыхтавана студэнтамі і выкладчыкамі гістарычнага факультэта БДУ пры падтрымцы дачкі, кіраўніка Творчай майстэрні архітэктара Галіны Левінай.

Першымі наведвальнікамі сталі навучэнцы школы аграгарадка Гарадок Маладзечанскага раёна. Яны змаглі паразмаўляць з будучымі гісторыкамі і дачкой Леаніда Левіна.

Выстаўка з'яўляецца адным з мерапрыемстваў праекта гістарычнага факультэта «Памяць жыве ў пакаленнях». Ён прымеркаваны да Года гістарычнай памяці і накіраваны на захаванне малавядомых, але значных дат Вялікай Айчыннай вайны, дапаўненне хронікі ваенных гадоў унікальнымі падзеямі, якія паказваюць гераізм і патрыятызм беларускага народа.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Важная справа

# НА МОВЕ МОЛАДЗІ І БЕЗ ФАРМАЛІЗМУ

**«Традыцыйныя формы работы з моладдзю працуюць далёка не заўсёды, таму неабходна шукаць новыя, больш эфектыўныя прыёмы. Мы павінны ісці ў інтэрнэт. Маладых трэба чуць, часцей запрашаць іх на дыялогавыя пляцоўкі, даваць ім магчымасць выказацца, быць адкрытымі да іх ініцыятыў. Трэба паскорыцца ў «раскручванні» цікавай тэматыкі», — такую думку агучыла на прэс-канферэнцыі, прысвечанай грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню моладзі, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама Вольга ЧАМАДАНАВА.**

«Сёння вельмі важна знайсці і выхаваць у маладзёжным асяроддзі лідараў, а мы будзем тымі, хто іх падтрымае і накіруе. Напрыклад, пры Мінскім гарадскім Савеце дэпутатаў дзейнічае Маладзёжны савет, у які абраныя 57 маладых людзей. Адна з функцый савета — быць сувязным звяном паміж уладай і моладдзю. Для нас важна ведаць, якім бачаць далейшае развіццё горада маладыя людзі», — падкрэслівае Вольга Чамаданава.

Адзін з унікальных гарадскіх маладзёжных праектаў — «Мінская змена». Ён накіраваны на фарміраванне грамадзянскай пазіцыі, сацыяльнай адказнасці, палітычнай культуры, раскрыццё творчага патэнцыялу студэнцкай моладзі навучальных устаноў Мінска. Яшчэ адна мэта праекта — выявіць лідараў з кола студэнцкай моладзі і прыцягнуць іх да вырашэння сацыяльна-эканамічных пытанняў жыццядзейнасці горада, а таксама сфарміраваць патэнцыяльны кадравы рэзерв для работы і практычнай дзейнасці ў органах дзяржаўнай улады. Праграма праекта ўключае некалькі этапаў. Удзельнікі праходзяць навучанне па праектным менеджменце, бізнес-планаванні, практыкумы і майстар-класы па арганізацыі праектнай дзейнасці, трэнінгі, накіраваныя на фарміраванне навыкаў камандаўтварэння і работы ў камандзе з прымяненнем сучасных тэхналогій; удзельнічаюць у дыялогавых пляцоўках. У маладых людзей ёсць магчымасць папрацаваць у цеснай звязцы з гарадской адміністрацыяй і атрымаць першы досвед кіраўніцкай дзейнасці. Фінальны этап — абарона інавацыйных праектаў, карысных для горада. Студэнты прапануюць свае ідэі па розных напрамках: маладзёжная палітыка, горадабудаўніцтва і архітэктура, экалогія і добраўпарадкаванне, адукацыя, медыцына, культура, спорт і турызм, развіццё малога бізнесу і іншых. Праект «Мінская змена» — комплексны і вельмі важны ў сучасных умовах.

А ў канцы 2021 года ў сталіцы запусцілі новы праект — **М-стрым. Мінскі маладзёжны стрым** — новы фармат зносін Мінгарвыканкама і сталічнай моладзі. Мяркуецца, што такія сустрэчы стануць рэгулярнымі. Чарговая пройдзе ў сакавіку ў Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці. «Як высветлілася, не ўсе ведаюць пра існаванне гэтага музея, а менавіта адсюль і трэба распачынаць патрыятычнае выхаванне. Там прадстаўлены ўсе этапы станаўлення незалежнай беларускай дзяржавы, гэта вельмі цікавае і знакавае месца, — падкрэсліла Вольга Чамаданава і дадала: «Сустракаючыся з моладдзю, я заўсёды ацэньваю задавальненне. Яны задаюць шмат пытанняў, выказваюцца адкрыта, прапануюць цікавыя ідэі. Сёння недастаткова сказаць, што я патрыёт, — трэба даказваць гэта рэальнымі справамі».

Дарэчы, а што значыць быць патрыётам? Ці ёсць адназначны адказ на дадзенае пытанне?

**Намеснік міністра адукацыі Аляксандр КАДЛУБАЙ** расказаў, што падчас работы над праектам **Праграмы патрыятычнага выхавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2022—2025 гады было шмат дыскусій па згаданым пытанні. У выніку ў канчатковую рэдакцыю ўвайшлі наступныя тэрміны і азначэнні:** «патрыёт — чалавек, які свядома суадносіць сваю дзейнасць з інтарэсамі краіны, ідэнтыфікуе сябе і сваю будучыню з народам, гісторыяй, культурай і гатовы стаяць на абароне інтарэсаў Айчыны»; «патрыятызм — духоўны здабытак асобы, характарызуе найвышэйшы ўзровень яе развіцця, усвядомленая штодзённая дзейнасць грамадзяніна на карысць Радзімы, народа, дзяржавы»; «патрыятычнае выхаванне — працэс, які грунтуецца на патрыятычных каштоўнасцях, накіраваны на ўсталяванне і ўмацаванне падмурка агульнасці і кансалідацыі, усведамленне адзінства грамадскіх і дзяржаўных інтарэсаў».

«Быць патрыётам, — падкрэслівае Аляксандр Кадлубай, — значыць любіць Беларусь, жыць і працаваць у сваёй краіне для яе дабрабыту, шанаваць беларускую культуру, а таксама паважаць дзяржаўную сімволіку Рэспублікі Беларусь».

На яго думку, самае недаравальнае ў правядзенні выхаваўча-патрыятычнай работы — фармалізм, калі з'яўляецца жаданне паставіць птушку і закрыць тэму.

Аляксандр Кадлубай паведаміў, што ў нашай краіне зарэгістравана каля 400 арганізацый, якія ажыццяўляюць маладзёжную палітыку, але рэальна на слыху дзейнасць толькі шаснаццаці з іх. Стратэгічнымі партнёрамі Міністэрства адукацыі выступаюць грамадскія аб'яднанні — Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя, «Белая русь»...

Дарэчы, гранты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь будуць прадастаўляцца цяпер і ў галіне маладзёжнай палітыкі нароўне са сферамі навукі, адукацыі, аховы здароўя і культуры. Адпаведны ўказ падпісаў у канцы снежня 2021 года кіраўнік нашай дзяржавы. А Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і Банка развіцця запусціў летась конкурс маладзёжных ініцыятыў. Яго мэта — ацэнка і адбор ініцыятыў, накіраваных на ўключэнне моладзі ў творчую дзейнасць і сацыяльную практыку, павышэнне грамадзянскай актыўнасці, раскрыццё патэнцыялу. Галоўны прыз — грант на рэалізацыю ідэі. Фактычна, у краіне быў пакладзены пачатак фарміравання грантавай сістэмы ў рамках маладзёжных ініцыятыў.

Яшчэ адзін новы маштабны рэспубліканскі патрыятычны праект БРСМ — «Ведай Беларусь», у рамках якога прайшлі серыя анлайн-квізаў, турнір па зборы пазлаў «Ведай Беларусь» і рэспубліканскі чэмпіянат па хуткаснай зборцы спілс-карты.

Адзін з новых кірункаў стратэгіі развіцця БРСМ — прававое выхаванне моладзі. Для дасягнення пастаўленых мэт Саюз моладзі плануе праводзіць навучальныя і інфармацыйныя мерапрыемствы, накіраваныя на павышэнне ўзроўню прававой адукаванасці і прававой культуры моладзі.

Таксама ў Год народнага адзінства прайшла рэспубліканская патрыятычная акцыя «Роднае — народнае», накіраваная на папулярызацыю дзяржаўных сімвалаў.

Своеасаблівай візітнай карткай БРСМ сталі адкрытыя дыялогі. Толькі ў Мінскай вобласці на працягу мінулага года было арганізавана 246 адкрытых дыялогавых пляцовак, на якіх узнімаліся пытанні самарэалізацыі моладзі ў прафесіі і творчасці, грамадскай работы, абмяркоўвалася новая стратэгія развіцця арганізацыі. Удзел у іх узяло больш як 6,5 тысячы чалавек.

Моцны ў Беларускім рэспубліканскім саюзе моладзі і такі напрамак, як валанцёрства. Яго валанцёры займаюцца добраўпарадкаваннем пахаванняў, аднаўленнем святынняў Беларусі, дапамагаюць у рэканструкцыі храмаў і добраўпарадкаванні прылеглай да іх тэрыторыі. Ці ж гэта не праява патрыятызму?

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Надвор'е

# ВОСЬ ТАБЕ І ВЯСНА — УНАЧЫ ДА 15 МАРОЗУ

**Каляндарная зіма скончылася. Дарэчы, яна, паводле папярэдніх ацэнак, у асноўным апынулася на 1-2 градусы цяплейшай за кліматычную норму.**

Разам з тым, у пачатку гэтага тыдня ноччу тэмпературны фон па краіне будзе зусім не вясновым — ад мінус 1 градуса да 10 марозу, а пры праясненнях, у асноўным па паўночным усходзе і паўночным захадзе краіны, чакаецца пахаладанне і мінус 14—15 градусаў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Першы вясновы месяц пачнецца сонечным надвор'ем. У аўторак максімальная тэмпература паветра складзе ад нуля да 6 цяпла. Ападкаў не будзе і ў сераду, толькі месцамі па паўднёвым усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі. Вецер паўночна-заходні, паўночны ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 градуса па паўднёвым усходзе да 11 марозу па паўночным захадзе краіны, пры праясненнях мінус 12—14 градусаў. Удзень будзе ад мінус 1 да 6 цяпла.

Мокры снег, удзень — мокры снег з дажджом будзе ісці ў чацвер па паўднёвым усходзе краіны. На астатняй тэрыторыі — пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай на асобных участках дарог прагназуецца галалёдзіца. Вецер паўночнай чвэрці ўмераны. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны складзе ад нуля па паўднёвым усходзе да мінус 8 градусаў па паўночным захадзе краіны, пры праясненнях — да мінус 10 градусаў. Удзень будзе ад мінус 1 да плюс 5 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу месцамі па краіне пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег. Ападкі зробяць надвор'е мякчэйшым. Тэмпература паветра ноччу складзе ад мінус 1 градуса да 7 марозу. Удзень будзе ад мінус 2 градусаў да 3 цяпла. Так, да ўпэўненага цяпла яшчэ далёка...

**Сяргей КУРКАЧ.**


белагропромбанк
традиции будущего

ОАО «Белагропромбанк»

С 01 марта 2022 года на основании постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 28.02.2022 № 95, ставка рефинансирования устанавливается в размере 12,0 процентов годовых.

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает об увеличении процентных ставок по договорам банковского вклада «Универсальный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006 и «Сберегательный», заключенным в период с 25.10.2004 по 05.03.2006 на 2,75 процентных пункта с 01 марта 2022 года.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 13 февраля 2019 года выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.*


**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Эйсмант Наталлі Мікалаеўне, прэс-сакратару Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у сувязі з вялікім горам — смерцю СВЕКРЫВІ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Белаконеву Алегу Аляксеевічу ў сувязі з напаткалым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае глыбокія спачуванні Эйсмант Наталлі Мікалаеўне, прэс-сакратару Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у сувязі з вялікім горам — смерцю СВЕКРЫВІ.**

Атамныя тэхналогіі

# ЯДЗЕРНАЯ МЕДЫЦЫНА

## Лекі супраць раку, даследчы рэактар і навуковыя праекты

**Вырабляць штогод па адным новым радыенуклідным фармацэўтычным прэпараце і стварыць Цэнтр ядзернай навукі і тэхналогій з функцыянальным даследчым ядзерным рэктарам. Пра гэтыя і іншыя планы, а таксама найноўшыя методыкі лячэння захворванняў і сумесныя расійска-беларускія праекты ў сферы тэхналогій ядзернай медыцыны расказалі эксперты галіны.**



Фота БелТА.

У ізатопнай лабараторыі 5-й сталічнай бальніцы.

### ПЭТ КТ-дыягностыка і ізатопная тэрапія

У ядзернай медыцыне для дыягностыкі і клінічнага лячэння паталогій прымяняюць радыенуклідныя фармацэўтычныя прэпараты (РФП). У сваёй аснове яны маюць пэўныя радыенукліды, для вытворчасці якіх выкарыстоўваецца дзве асноўныя базы. Адна частка гэтых радыенуклідаў ствараецца на ядзерных рэактарах, другая — на цыклатронах. З першай часткай радыенуклідаў у Беларусі працуюць аддзяленні ядзернай медыцыны, а з радыенуклідамі, якія ствараюцца на цыклатронах, працуе НПЦ анкалогіі і сканеры ПЭТ КТ (пазітронна-эмісійная тамаграфія і камп'ютарная тамаграфія), якія ўстаноўлены ў Мінскім анкацэнтры, расказаў **Валерый СІНАЙКА, загадчык Рэспубліканскага цэнтра пазітронна-эмісійнай тамаграфіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, галоўны пазаштатны спецыяліст па прамянёвай дыягностыцы:**

*— Гібрыдны метад — ПЭТ, які сумешчаны з КТ, — гэта тэхналогія XXI стагоддзя, бо ПЭТ развіваецца ў Беларусі з канца 60-х гадоў мінулага стагоддзя, а першы ПЭТ КТ-сканер запрацаваў толькі ў 2001-м. ПЭТ КТ-дыягностыка ў асноўным выкарыстоўваецца ў лячэнні анкалагічных паталогій, аднак прымяняюць яе таксама ў галінах кардыялогіі, неўралогіі і нейрахірургіі. Патрэбы ў ПЭТ КТ-дыягностыцы няспынна растуць: — за апошнія пяць гадоў колькасць абследаваных пацыентаў узрасла ўдвая (звыш 8,5 тысячы было абследавана летась, а ўсяго даследавана больш як 40 тысяч). Далейшыя перспектывы развіцця напрамую звязаны з магчымасцю сінтэзу новых РФП і стварэння на іх аснове новых малекул. Калі б у ідэале мы мелі малекулу, якая ўбудоўвалася б у абмен рэчываў толькі пэўнага органа ці тканкі, то падышлі б да аднаго са шляхоў персаніфікацыі лячэння пацыентаў.*

Дыягнастычныя падраздзяленні ў Беларусі ёсць у кожнай вобласці і нават не ў адзінкавым варыянце, функцыянуе 21 ізатопная лабараторыя і два радыялагічныя аддзяленні ў Гомелі і Мінску, дадаў **Дзмітрый КЛІМЕНКА, загадчык радыялагічнага аддзялення № 4 Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага цэнтра:**

*— У краіне прымяняецца тры віды тэрапіі з выкарыстаннем адкрытых ізатопаў: радыетэрапія дыфузнага таксічнага валяку (летась пралечана 96 пацыентаў), радыетэрапія дыферэнцыраванага раку шчытападобнай залозы (2546 працэдур летась), палеатыўная тэрапія касцявых метастазаў стронцыем (штогод ад 50 да 100 пацыентаў).*

### Гібрыдныя малекулы і цэнтралізаваная радыефармацэўтыка

Каб тэхналогіі медыцынскай радыялогіі развіваліся, патрэбны тры асноўныя складнікі. РФП і абсталяванне, на якім яны вырабляюцца; клінічныя сканеры, якія выкарыстоўваюць для працэдур і візуалізацыі лячэння; а таксама добрыя інфармацыйныя рашэнні, расказала **Юлія КУРАШВІЛІ, саветнік віцэ-прэзідэнта па праектах даследчых рэактараў і цэнтраў ядзернай навукі і тэхналогій «Русатам Аверсіз»:**

*— Сучасная радыефармацэўтыка мае тры асноўныя трэнды. Першы — таргетныя прэпараты (калі мы да дакладнага рэцэптара падбіраем вектарную малекулу, на аснове якой вырабляецца РФП). Другі — тэанастычныя РФП (калі існуюць таргетная вектарная малекула і радыенуклід, які мае камбініраваныя радыенукліды з рознымі тыпамі выпраменьвання: кароткім, які ўздзейнічае на зону цікавасці, і доўгім, які дазваляе ў рэжыме рэальнага часу бачыць і кантраляваць ход працэдуры). Трэці — цэнтралізаваныя радыефармацэўтычныя вытворчасці ўзамен лакальных, шпітальных.*

Юлія Курашвілі згадала, што гісторыя развіцця радыефармацэўтыкі налічвае больш за 70 гадоў. Да пачатку 2000-х магчымасці былі абмежаваныя. Спачатку можна было візуалізаваць орган, пасля — функцыю, а ў плане лячэння яшчэ больш вузкі спектр — шчытападобная залоза. У апошнія 20 гадоў, дзякуючы таму, што з'явіўся трэнд на развіццё як апаратнай базы, так і фармакалогіі, навукоўцы ідуць па шляху стварэння гібрыдных рашэнняў — гібрыдных сканераў і малекулаў (з антыцеламі, анцігенамі, пептыдамі).

*— Напрамак стварэння гібрыдных малекул даў абсалютна ўнікальныя і неабмежаваныя магчымасці для клініцыстаў у лячэнні пацыентаў, якія яшчэ ўчора лічыліся неперспектыўнымі (інкурабельнымі). Сёння мы можам лячыць пацыентаў не толькі з метастатычнымі формамі злаякасных захворванняў, але і з іншымі сацыяльна значнымі хваробамі, накшталт сістэмных захворванняў: атэрасклерозу, нейрагенератыўных захворванняў, запаленчых працэсаў,* — падкрэсліла Юлія Курашвілі. *— Аднак з-за таго, што РФП вельмі складаныя, праблема іх даступнасці стала яшчэ больш актуальнай. Лячэбным установам, з аднаго боку, неабходна ўкладваць сродкі ў развіццё інфраструктуры блокаў, дзе ствараюцца РФП, з другога — ім трэба пашыраць клінічны складнік: новыя сканеры, памяшканні для размяшчэння абсталявання. Самае аптымальнае рашэнне сёння — пераход ад лакальных, шпітальных радыефармвытворчасцяў да цэнтралізаванага, што дазволіць аптымізаваць расходы і стварыць вытворчасць з адзіным стандартам. Хоць гэта дорага, затое больш прывабна, чым ствараць такую вытворчасць у кожнай лячэбнай установе.*

### Ратуем рэальныя жыцці

З ізатопам тэхнецый-99m, які вельмі запатрабаваны ў дыягностыцы захворванняў, у Расіі і Беларусі пачалі працаваць у сярэдзіне 80-х гадоў. Стварылася праграма СССР па ядзернай медыцыне, да якой былі падключаны савецкія краіны. І ў Беларусі быў атрыманы шэраг кампетэнцый, якія захаваныя дагэтуль, і нават спецыялісты тых часоў працуюць, нагадаў **Міхаіл ЖЭМЖУРАЎ, загадчык лабараторыі радыяцыйна-хімічных даследаванняў навакольнага асяроддзя Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў — Сосны НАН:**

*— Вырабіць тэхнецый-99m можна з асколачнага малібдэну, які з'яўляецца вынікам дзялення ядзернага паліва і жыве шэсць гадзін. За гэты час яго неабходна ўвесці ў арганізм пацыента і правесці дыягностыку. Атрымаць асколачны ізатоп у Беларусі было складана, асабліва ў тыя часы, таму мы пайшлі іншым шляхам. Сканцэнтраваліся на стабільным ізатопе малібдэну-98, які змяшчалі ў рэактар і апраменьвалі сур'ёзным патокам нейтронаў. І ўжо з гэтага апрамененага парашку атрымлівалі тэхнецый-99m, выдзялялі яго ў выглядзе раствору і развозілі па бальніцах. Для ўнутранага спажывання гэтага было дастаткова. Аднак пасля распаду СССР рэактар спынілі, і мы апраменьвалі малібдэн-98 на Ігналінскай атамнай станцыі, у Кіеве, Обнінску. Аднак з часам і гэтая магчымасць спынілася.*

З 2015 года прапрацоўваецца пытанне аб стварэнні ў Беларусі Цэнтра ядзернай навукі і тэхналогій з даследчым ядзерным рэактарам. Даследчы рэактар стварыць нескладана, аднак патрэбна абалонка (комплексы, якія будуць яго акружаць). Навукоўцы бачаць восем комплексаў і ўчасткаў, два з якіх будуць медыцынскага прызначэння. Першы — радыехімічны для вытворчасці ізатопаў для дыягностыкі і, магчыма, тэрапіі, а таксама вырабу гатовых РФП. Другі — участак радыяцыйнай стэрылізацыі (абеззаражвання) медыцынскіх вырабаў і харчовых прадуктаў. Універсальная гама-устаноўка працуе ў інстытуце, дарэчы, і цяпер.

*— Трэба глядзець стратэгічна — якія ізатопы будуць запатрабаваны не толькі сёння, а праз дзясяткі гадоў. Калі мы ствараем комплекс, павінны закласці магчымасці яго развіцця. Ці патрэбна нам рабіць так, каб комплекс быў не толькі даследчым, але функцыянаваў яшчэ і як медыцынская ўстанова, трэба глядзець. Менавіта таму так доўга вядзецца работа па яго стварэнні. У распрацоўцы павінны быць адлюстраваны і запыты нашых медыкаў.*

У Белмедуніверсітэце працуе ўнікальная кафедра радыяцыйнай медыцыны і экалогіі, якой няма не толькі ў краіне, але і ў многіх іншых дзяржавах, расказаў **Арам АВЕЦІСАЎ, дацэнт кафедры радыяцыйнай медыцыны і экалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта:**

*— Наша задача — даць асновы ведаў па трох напрамках: у галіне радыебіялогіі (асновы дзеяння іанізуючых выпраменьванняў і ўсё, звязанае з гэтым); у галіне заканадаўства (шмат, мала, добра, кепска, чым рэгламентуецца і як на гэта рэагаваць); у галіне медыцыны (што, дзе і як выкарыстоўваецца). У нас няма задачы рыхтаваць канечнага спецыяліста, гэта і немагчыма. Нельга стаць нейрахірургам пасля заканчэння медінстытута, але ведаць, што такое сэрца, як яно працуе і што з ім можна і трэба рабіць — наша задача. Гэтак жа і наша кафедра.*

На лекцыях студэнтам даецца інфармацыя, якая звязана з РФП. Абітурыентам найперш расказваюць, што, навошта і для чаго выкарыстоўваецца. І ўжо пасля дадаюць, што можна яшчэ выкарыстоўваць, якія ёсць прэпараты і ў якіх галінах іх можна прымяніць. Сучасная ПЭТ-дыягностыка выкарыстоўваецца ўжо ў анкалогіі, неўралогіі, кардыялогіі, эндакрыналогіі і іншых сферах, патлумачыў дацэнт. Штогод навукоўцы стараюцца ездзіць у іншыя краіны, каб даведацца, што з'явілася новага, каб перадаць гэта студэнтам.

— Развіццё тэхналогій не стаіць на месцы, і мы таксама абавязаны развівацца, бо гэта ратуе рэальныя жыцці. Калі ўчора лімфагрануляматоз быў практычна прысудам, то сёння гэта не так.

### Чарга на лячэнне і эканамічная мэтазгоднасць

У Беларусі на цыклатронах вырабляюцца нукліды з ультракароткім перыядам дзеяння: фтор-18 (перыяд паўраспаду — крыху менш за дзве гадзіны) і вуглярод-11 (20 хвілін). На іх аснове можна карыстацца чатырма малекуламі — чатырма прэпаратамі.

Праблем з чэргамі на абследаванне анкахворых у краіне няма, прынамсі ў сталіцы, сцвярджаюць спецыялісты. Для пацыентаў, у якіх анакалогія была выяўлена ўпершыню і якім патрэбна даабследаванне ПЭТ КТ, чэргаў практычна няма.

*— Калі чалавек амбулаторна прыходзіць да нас у цэнтр, то гэта не больш як тыдзень. Калі пацыент у стацыянары — гэта 24 гадзіны, не ўлічваючы выхадных. Для пацыентаў з планавым абследаваннем, каб ацаніць лячэнне ці адчувальнасць да пэўных анкапрэпаратаў, падрыхтаваць чалавека да прамянёвай тэрапіі, крытычных чэргаў таксама няма. Бываюць затрымкі. Вось і цяпер ПЭТ-цэнтр тыдзень не працуе — праводзіцца тэхабслугоўванне. Гэта крыху расцягне чаргу, але на працягу двух-трох тыдняў работа адновіцца,* — патлумачыў Валерый Сінайка. *— Нам хацелася б, каб РФП было больш. З расійскімі калегамі мы прапрацоўваем магчымасць пастаўкі ў Беларусь ізатопу лютэцый-177 і стварэння на яго аснове РФП.*

Што датычыцца эканамічнай мэтазгоднасці распрацоўкі прэпаратаў, эксперт заўважыў, што трэба глядзець, наколькі апраўдана распрацоўка дарагога нова-га РФП, на што трэба патраціць шмат сродкаў. Калі колькасць пацыентаў, якім патрабуюцца такое лячэнне і дыягностыка, невялікая (пяць чалавек на год), прасцей адправіць іх на лячэнне ці дыягностыку ў Расію (беларускі бок аплачвае пацыенту праезд і расходы, расійскі — лячэнне). Калі ж такіх пацыентаў сотні, то трэба ствараць сваё.

**Ірына СІДАРОК.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1:

- капитальное строение, инв. № 412/С-13421 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), общей площадью 123,6 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Песковский с/с, аг. Пески, ул. Заводская, 35/1;
- капитальное строение, инв. № 412/С-13422 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – приемный цех молока), общей площадью 1214,3 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Песковский с/с, аг. Пески, ул. Заводская, 35;
- капитальное строение, инв. № 412/С-13423 (назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – водонапорная башня), общей площадью 10,1 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Песковский с/с, аг. Пески, ул. Заводская, 35/2;
- капитальное строение, инв. № 412/С-13424 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), общей площадью 90,9 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Песковский с/с, аг. Пески, ул. Заводская, 35/4;
- капитальное строение, инв. № 412/С-23727 (назначение – здание специализированное энергетики, наименование – трансформаторная подстанция), общей площадью 21,2 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Песковский с/с, аг. Пески, ул. Заводская, 35/3;
- оборудование: резервуар Я-10В 34025 (2 шт.), артезианская скважина, ограждение, наружные канализационные сети; электроснабжение проходной и наружного освещения молокоприемного пункта «Пески».

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 424085404101000240, площадью 2,7361 га (назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения (обслуживания строений)), расположенном по адресу: Мостовский р-н, Песковский с/с, аг. Пески, ул. Заводская, 35. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в прибрежных полосах водных объектов, площадью 2,7361 га.

Начальная цена продажи – 23 528,22 руб. (двадцать три тысячи пятьсот двадцать восемь рублей двадцать две копейки) с учетом НДС. Сумма задатка – 2 352,82 руб. (две тысячи триста пятьдесят два рубля восемьдесят две копейки)

Продавец – Волковысское открытое акционерное общество «Беллакт», 231900, г. Волковыск, ул. Октябрьская, 133, тел. 8-01512-750-25

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 15 марта 2022 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 05.11.2021 г.

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 11 марта 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion**

---

*Уважаемые акционеры ОАО «МАПИД»*

**31 марта 2022 года**

**состоится годовое общее собрание акционеров**

## ОАО «МАПИД»,

*расположенного по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205.*

Собрание созывается по инициативе Наблюдательного совета ОАО «МАПИД».

**Собрание пройдет по адресу:** г. Минск, ул. К. Либкнехта, 130. (Пристройка к общежитию ОАО «МАПИД»).

**Повестка дня**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2021 год и основных направлениях деятельности Общества на 2022 год.
2. О работе наблюдательного совета в 2021 году.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2021 год. Утверждение Положения о ревизионной комиссии ОАО «МАПИД».
4. Об утверждении годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2021 год.
5. Об утверждении порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2021 год. О выплате дивидендов за 2021 год.
6. Об утверждении плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, на 2022 год и первый квартал 2023 года. Периодичность выплаты дивидендов в 2022 году.
7. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. Об утверждении новой редакции Устава ОАО «МАПИД».

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни с 9.00 до 16.00 по месту нахождения Общества: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, каб. № 303 (расположение в 5-этажном административном здании):

- с 11.03.2022 по 30.03.2022 – ознакомление с информацией о деятельности Общества за 2021 год;
- с 24.03.2022 по 30.03.2022 – ознакомление с иными материалами по вопросам повестки дня общего собрания акционеров;
- 31.03.2022 по всем вопросам повестки дня – с 13.00 до 14.30 по месту проведения собрания.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров сформированного на 11 марта 2022 года.

Регистрация участников собрания с 13.00 до 14.30 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания – 31 марта 2022 года, 15.00.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
- акционеру общества – паспорт;
- представителю акционера – паспорт и доверенность.

***Администрация***

УНП 100008115

---

## ДОПОЛНЕНИЯ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «НикаПроект»,

***опубликованной в газете «Звязда» 26.02.2021 г.***
по объекту **«Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями на пересечении ул. Прилукской – ул. Глаголева – пр. Жукова» (3-я очередь строительства)**
(3–7-я секции)

**Характеристика объекта строительства:** проектной документацией предусматривается в том числе строительство встроенного нежилого помещения общей площадью 494,0 кв. м, расположенного в 6-й секции на 2-м нежилом этаже с обособленным входом непосредственно с улицы со стороны пр. Жукова с уровня эстакады.

Высота помещения составляет 3,55 метра. Встроенное помещение изолировано от жилой части дома глухими стенами и перегородками. Окна и входные двери – витражные из алюминиевых профилей с заполнением стеклопакетами. В качестве наружной отделки стен применяются навесной «вентилируемый фасад» с применением керамогранитных плит. Проектом предусмотрено создание безбарьерной среды, а также благоустройство территории в границах работ 3-й очереди.

Встроенное помещение передается с черновой внутренней отделкой: штукатурка стен, стяжка пола. Система отопления встроенного помещения выполняется отдельно от системы отопления жилого дома, с установкой индивидуального прибора учета тепла. Отопление водяное, предусмотрена вертикальная и горизонтальная (в конструкции стяжки пола) разводка, отопительные приборы. Система вентиляции встроенного помещения – приточно-вытяжная механическая и частичная естественная вентиляция (приток) с механической вытяжкой. Водоснабжение встроенного помещения – от отдельной системы водопровода низкого давления с установкой индивидуальных приборов учета потребляемой воды, предусмотрена установка и подключение унитаза. Электроснабжение встроенного помещения – разводка до вводного устройства с установкой вводного устройства и счетчика. Запроектировано строительство пассивной оптической сети, предусматривающей телефонизацию и телефикацию по протоколу IP и подключение к Интернету по технологии xPON – ввод сетевого кабеля в помещение, оптическая розетка. Встроенное помещение оборудуется автономной неадресной системой пожарной сигнализации и системой оповещения – типа «СО-2». По соглашению сторон отдельные виды работ могут не выполняться.

**Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются офисные помещения по цене за 1 кв. м, эквивалентной 1 800,00 долларам США.**

**Условия оплаты:** оплата 100 % стоимости объекта долевого строительства в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном и распорядительном органе. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа. По соглашению сторон дольщику могут быть предоставлены скидки от общей стоимости объекта, либо иные условия его оплаты.

---

**ЗАО «БелБанкротАукцион»**, организатор торгов по продаже имущества ЗАО «Торговый Дом «Луч-М» (УНП 101472969) объявляет о проведении **31.03.2022 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

**Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке:** https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2022/02/spisok-imushhestva-torgovyj-dom-luch-m.pdf

**Местонахождение имущества:** Брестская обл., г. Пинск, ул. Иркутско-Пинской дивизии, 8.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

**Продавец:** ЗАО «Торговый Дом «Луч-М», тел. +375296953010.

**Организатор торгов:** ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **30.03.2022 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 01.03.22** по **17.00 30.03.22** на bankrottorg.by.

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счету-фактуре; аукционный сбор: 3 % от цены реализации предмета торгов.

Дополнительное условие: ипотека банка.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в течение тридцати календарных дней со дня проведения аукциона.

---

Комиссией по проведению Рекламной игры было принято решение

**ОБ ОТМЕНЕ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Золото не за горами!»,**

зарегистрированной Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь, свидетельство о государственной регистрации № 4157 от 21.02.2022.

Правила проведения Рекламной игры «Золото не за горами!», опубликованные в газете «Звязда» № 39 от 26.02.2022, являются недействительными.

Информация об отмене проведения Рекламной игры «Золото не за горами!» также размещена на интернет-сайте **www.bsb.by.**

Информацию также можно уточнить по телефону контакт-центра: единый номер 306 20 40.

Приносим свои извинения.

Организатор ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ», УНП 190771520.

---

***Уважаемые акционеры ОАО «Электроремонтный завод»***

**31 марта 2022 года в 13.00**

**состоится очередное общее собрание акционеров**

## ОАО «Электроремонтный завод»

**Собрание пройдет по адресу: г. Минск, промузел Колядичи, ул. Бабушкина, 19, третий этаж, зал заседаний.**

**Повестка дня собрания**

1. О финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2021 год и основных направлениях деятельности Общества на 2022 год.
*Докладчик – директор Общества.*
2. Отчет о работе наблюдательного совета в 2021 году.
*Докладчик – председатель наблюдательного совета Общества.*
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2021 год.
*Докладчик – председатель ревизионной комиссии Общества.*
4. Утверждение бухгалтерского баланса Общества, отчета о прибылях и убытках.
*Докладчик – главный бухгалтер Общества.*
5. О распределении прибыли и убытков, выплате дивидендов за 2021 год.
*Докладчик – главный бухгалтер Общества.*
6. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении Общества (после уплаты налогов, сборов, пошлин, других обязательных платежей) на 2022 год и 1-й квартал 2023 года. Периодичность выплаты дивидендов за 2022 год.
*Докладчик – главный бухгалтер Общества.*
7. Избрание членов наблюдательного совета.
8. Избрание членов ревизионной комиссии.
9. О размерах вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества за осуществление возлагаемых на них обязанностей.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 19 (приемная директора, 3-й этаж) с 21.03.2022 г. по 30.03.2021 г. (время работы с 12.00 до 15.00) в рабочие дни понедельник–четверг и в день проведения собрания 31.03.2022 г. с 11.00 до 12.30.

Регистрация участников собрания 31 марта 2022 года с 11.00 до 12.30 по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра акционеров на 01 марта 2022 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы:**
**- акционеру общества – паспорт;**
**- представителю акционера и юридическим лицам – паспорт и доверенность!**

УНП 100008169

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

## ОАО «Белбуд» (далее – Общество)

Сообщаем Вам, что годовое общее собрание акционеров открытого акционерного общества «Белбуд» (далее – Общество) будет проводиться в очной форме 30.03.2022 в 15.00 по адресу места нахождения Общества: 220113, г. Минск, ул. Восточная, 133, офис 1.

Дата, время и место проведения собрания: **30.03.2022 в 15.00 (г. Минск, ул. Восточная, 133, офис 1, кабинет 101).**

**Повестка дня**

1. О рассмотрении заключения ревизионной комиссии Общества по результатам годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2021 год.
2. Об утверждении годового отчета Общества за 2021 год.
3. Об утверждении годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2021 год.
4. О рассмотрении аудиторского заключения по результатам аудита годовой бухгалтерской отчетности за 2021 год.
5. О распределении убытков по итогам работы Общества за 2021 год.

Органом, созывающим годовое общее собрание акционеров, согласно п. 6.4 Устава Общества является наблюдательный совет Общества.

Годовое общее собрание акционеров созывается в соответствии с ч. 3 ст.36 Закона Республики Беларусь от 09.12.1992 № 2020-XII «О хозяйственных обществах» и решением наблюдательного совета Общества от 28.02.2022 (протокол № 2 (149)).

Порядок ознакомления лиц, имеющих право на участие в собрании: начиная с 09.03.2022 (понедельник–четверг – с 8.30 до 16.00 (обед с 13.00 до 13.20)) по адресу: г. Минск, ул. Восточная, 133, офис № 1 (в приемной генерального директора), а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Место и время начала регистрации участников собрания: с 14.30 до 14.50 в день и по месту проведения собрания.

Участники годового общего собрания акционеров ОАО «Белбуд» обязаны при регистрации предъявить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность (представители акционеров – паспорт и доверенность).

УНП 100794022

---

## ОАО «ЛИФТСЕРВИС»

***(место нахождения: г. Минск, пер. Велосипедный, 5/2-1)***

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ГОДОВОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Собрание состоится 23 марта 2022 г. по адресу: г. Минск, Велосипедный пер., 5, 4-й этаж, актовый зал. Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 12.00 до 14.00. Начало работы собрания в 14.15.

**Повестка дня**

**1.** Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «ЛИФТСЕРВИС» в 2021 году и основных направлениях деятельности общества на 2022 год.
**2.** О работе наблюдательного совета.
**3.** О результатах ревизии финансово-хозяйственной деятельности общества за 2021 год и аудита бухгалтерской отчетности, утверждение годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества.
**4.** О распределении прибыли общества, остающейся в распоряжении общества за 2021 год. О выплате дивидендов за 2021 год и об утверждении плана использования прибыли на 2022 год.
**5.** Избрание членов ревизионной комиссии общества.
**6.** Избрание членов наблюдательного совета общества.
**7.** О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии на период с 01.04.2022 года по 31.03.2023 года.
**8.** Увеличение уставного фонда ОАО «ЛИФТСЕРВИС».
**9.** Утверждение новой редакции Устава ОАО «ЛИФТСЕРВИС».

Для регистрации участнику собрания необходимо предъявить документ, удостоверяющий личность, а также, если необходимо, документы, подтверждающие его полномочия: доверенность и/или другие документы в соответствии с действующим законодательством.

Ознакомление лиц, имеющих право на участие в собрании, с материалами, подготовленными к проведению собрания, будет осуществляться с 02.03.2022 г. по 22.03.2022 г. в рабочие дни и в рабочее время по месту нахождения общества (тел. 390 97 16, 390 97 11) либо 23.03.2022 – по месту проведения собрания.

Дата формирования реестра акционеров ОАО «ЛИФТСЕРВИС» для составления списка лиц, имеющих право на участие в годовом общем собрании, – 24 февраля 2022 года.

**Наблюдательный совет общества**

УНП 100088852

Энергаэфектыўнасць

# ЭЛЕКТРАДАМЫ МЫ БУДЗЕМ УЗВОДЗІЦЬ КОМПЛЕКСНА

**Пра гэта заявіў намеснік старшыні Дзяржстандарта — дырэктар дэпартамента па энергаэфектыўнасці Віталь КРЭЦКІ, адказваючы на пытанні журналістаў перад выніковай калегіяй ведамства.**

## ЯШЧЭ БОЛЬШ АШЧАДНА

Наша краіна разлічвае да канца пяцігодкі паменшыць энергаёмістасць дзесьці на 7 %. Цікава, ці рэальна цяпер будаваць такія планы, улічваючы, што нафта і газ па-ранейшаму адыгрываюць вялікую ролю, а акрамя таго, супраць нашай краіны ўведзены досыць жорсткія санкцыі? Віталь Крэцкі лічыць, што пастаўленая задача цалкам выканальная.

Дзяржпраграмай устаноўлены паказчык па зніжэнні энергаёмістасці ўнутранага валавога прадукту (ВУП) летась у памеры плюс 6,8 % да ўзроўню 2020 года пры тэмпах росту ВУП 101,8 %. Паводле папярэдніх звестак Белстата, за студзень—снежань мінулага года паказчык па зніжэнні энергаёмістасці склаў плюс 6,4 % да ўзроўню 2020 года пры тэмпах росту ВУП 102,3 %.

Акрамя таго, эканомія паліўна-энергетычных рэсурсаў (ПЭР) за мінулы год склала 685,8 тысячы тон умоўнага паліва пры плане 550 тысяч тон. Найбольшую эканомію рэсурсаў — 265,5 тысячы тон умоўнага паліва — удалося забяспечыць дзякуючы ўкараненню ў вытворчасць сучасных энергаэфектыўных тэхналогій, працэсаў, абсталявання і матэрыялаў. У планах на бягучы год — забяспячэнне аб'ёму эканоміі гэтых рэсурсаў не менш як 0,6 мільёна тон умоўнага паліва.

А санкцый мы не баімся. Яны былі ўведзены не ўчора, і — нічога. Як паказалі вынікі мінулых гадоў, санкцыі на энергаэфектыўнасць не ўплываюць ніяк. Нават назіраецца адваротны эфект, калі кіраўнікі рэальнага сектара эканомікі ў цяжкіх эканамічных умовах больш актыўна ўкараняюць энергаэфектыўныя мерапрыемствы, таму што гэта прыводзіць да зніжэння сабекошту прадукцыі.

«Павышэнне эфектыўнасці выкарыстання энергарэсурсаў на асобным прадпрыемстве адбіваецца перш за ўсё на зніжэнні энергаёмістасці выпускаемай прадукцыі і, як вынік, павышэнні яе канкурэнтаздольнасці як на ўнутраным, так і знешнім рынках», — падкрэсліў дырэктар дэпартамента па энергаэфектыўнасці. Як ён адзначыў, мэтавыя паказчыкі энергазберажэння на 2021 год, устаноўленыя дзяржпраграмай, выкананы большасцю органаў дзяржаўнага кіравання і рэгіёнаў.

## ПЕРАДАВІКІ СЯРОД ЛІДАРАЎ

Цікава, а якія пазіцыі нашай краіны ў дадзенай галіне ў параўнанні з моцнымі гульцамі? Як аказалася, эфектыўнасць работы ў Беларусі па зніжэнні энергаёмістасці айчыннага ВУП пацвярджаецца дадзенымі Міжнароднага энергетычнага агенцтва. Паводле іх інфармацыі, у 2019 годзе энергаёмістасць ВУП нашай краіны знізілася ў 2,1 раза да ўзроўню 2000 года. Гэта нашмат больш інтэнсіўна, чым зніжэнне энергаёмістасці такой эканамічна развітой краіны, як Швецыя, і ў 2 разы больш інтэнсіўна, чым у Канадзе — краіне з падобнымі кліматычнымі ўмовамі.

Фактычны паказчык энергаёмістасці ВУП Беларусі склаў 0,146 тоны нафтавага эквіваленту на 1 тысячу долараў ВУП па парытэце пакупніцкай здольнасці ў цэнах 2015 года. «У параўнанні з прамыслова развітымі краінамі — членамі ЕАЭС Беларусь займае лідзіруючае становішча», — заўважыў спікер.

## РОСТ МЯСЦОВЫХ РЭСУРСАЎ

Дырэктар дэпартамента адзначыў, што найважнейшым напрамкам зніжэння залежнасці краіны ад вуглевадародаў з'яўляецца павелічэнне выкарыстання мясцовых паліўна-энергетычных рэсурсаў, у тым ліку аднаўляльных крыніц энергіі (АКЭ). Доля мясцовых рэсурсаў у валавым спажыванні ПЭР летась склала 16,1 %. А прырост спажывання мясцовых паліўных рэсурсаў летась да 2020 года склаў каля 290 тысяч тон умоўнага паліва. Па выніках работы большасцю органаў дзяржкіравання, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам забяспечана выкананне ўстаноўленых мэтавых паказчыкаў па долі мясцовага паліва ў кацельна-пячных рэсурсах.

Што датычыцца фінансавання энергазберагальных мерапрыемстваў, то па выніках года асвоена 944 мільёны рублёў. Асноўнымі крыніцамі фінансавання былі ўласныя сродкі арганізацый і сродкі мясцовых бюджэтаў, доля якіх склала каля 80 % у агульным аб'ёме інвестыцый.

## ЗНІЗІЛІ СПАЖЫВАННЕ ГАЗУ

Паводле інфармацыі Віталя Крэцкага, сёлета будуць уведзены ў эксплуатацыю 22 энергакрыніцы на мясцовых відах паліва сумарнай цеплавой магутнасцю 94,3 МВт. Гэта дазволіць замясціць выкарыстанне імпартаванага паліва на 24,2 мільёна кубічных метраў. З іх 10 энергакрыніц магутнасцю 25,3 МВт будуць рэалізаваны за кошт уласных сродкаў прадпрыемстваў, мясцовага і рэспубліканскага бюджэтаў, 12 энергакрыніц магутнасцю 69 МВт — за кошт крэдытных сродкаў міжнародных фінансавых арганізацый.

Паводле яго слоў, летась былі ўведзены ў эксплуатацыю 14 энергакрыніц на мясцовых ПЭР сумарнай цеплавой магутнасцю 108,9 МВт, што дазволіла замясціць выкарыстанне імпартаванага паліва на 28 тысяч тон умоўнага паліва і знізіць спажыванне імпартаванага прыроднага газу на 27,4 мільёна кубічных метраў штогод.

У якасці прыкладу кіраўнік дэпартамента прывёў будаўніцтва летась камбінаванай кацельні на мясцовых рэсурсах і прыродным газе ў Шчучыне (Гродзенская вобласць) сумарнай цеплавой магутнасцю 12 МВт. У кацельні ўстаноўлены два сучасныя аўтаматызаваныя вадагрэйныя цвёрдапаліўныя катлы айчыннай вытворчасці цеплапрадукцыйнасцю 6 МВт кожны.

«Будаўніцтва новай кацельні дазволіла знізіць эксплуатацыйныя выдаткі на цеплазабеспячэнне горада за кошт замяшчэння імпартаванага прыроднага газу мясцовымі відамі паліва і вываду з эксплуатацыі неэфектыўнага абсталявання. Рэалізацыя праекта дазволіла замясціць выкарыстанне імпартаванага віду паліва на 300 тысяч долараў, знізіць сабекошт 1 Гкал адпускаемай цеплавой энергіі з 105,6 рубля да 75,2 рубля», — распавёў Віталь Крэцкі.

## НОВАЕ ДРАЎНЯНАЕ ПАЛІВА

Што датычыцца міжнароднага супрацоўніцтва, сёлета дэпартамент працягне падрыхтоўку і рэалізацыю сумесных з міжнароднымі арганізацыямі праектаў па павышэнні энергаэфектыўнасці і развіцці выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі.

У прыватнасці, у планах завяршыць інвестыцыйны праект «Выкарыстанне драўнянай біямасы для цэнтралізаванага цеплазабеспячэння». Ён прадугледжвае будаўніцтва і рэканструкцыю кацельняў жыллёва-камунальнай гаспадаркі з выкарыстаннем там драўнянага паліва. Таксама ведамства працягне работу па прыцягненні фінансавання для праекта па павышэнні энергаэфектыўнасці аб'ектаў сацыяльнай сферы.

## ЭЛЕКТРАМАШЫНЫ, ЭЛЕКТРАДАМЫ І ВАДАРОДНАЕ ПАЛІВА

Апошнім часам досыць актыўна вядзецца абмеркаванне магчымасці будаўніцтва другой атамнай станцыі ў Беларусі. Нам на самай справе так неабходная дадатковая электраэнергія? Зразумела, што дадзенае пытанне не зусім у кампетэнцыі названага дэпартамента, таму адказ на яго быў вельмі акуратным.

Віталь Крэцкі адзначыў, што калі такое рашэнне будзе прынята, то спецыялісты дэпартамента прымуць максімум намаганняў для таго, каб з эканамічна апраўданымі выдаткамі дадзеную станцыю ўвесці ў беларускую энергасістэму. За кошт якіх мерапрыемстваў? У першую чаргу, за кошт развіцця электратранспарту.

У нас сёння тэма нумар адзін — легкавы і грузавы транспарт, які сілкуецца ад электрычнасці. І далей будзе папулярызавацца гэты кірунак. Другой тэмай павінна стаць стварэнне сучасных электрычных цеплавых помпаў і акумулятараў.

«Сёння існуе адзін з перспектыўных напрамкаў — стварэнне вадароду для энергетычных мэт. Гэтая тэма новая, ёй цяпер актыўна займаюцца ў Германіі. Мы з ёй знаёмыя ўжо больш за два гады. Пад уздзеяннем электрычнасці са звычайнай вады атрымліваюць чысты вадарод і іншыя элементы. Мерапрыемства даволі складанае, але перспектыўнае».

Цяпер жа ў нашай краіне развіваецца ўжо не новы напрамак, які прадугледжвае будаўніцтва электрадамоў. Гэта жылы аб'ект, да якога ўмоўна падключаецца ўсяго толькі адзін кабель і адна труба, і інфраструктура для жыццезабеспячэння шматкватэрнага дома створана. У такіх новых дамах эксплуатацыйныя выдаткі будуць значна меншыя, чым у традыцыйных.

**Сяргей КУРКАЧ.**


# ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «СА «ЗВЯЗДОЮ» — СПАДРУЧНЕЙ!»

**I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

1. Рэкламная гульня пад назвай «Са «Звяздою» — спадручней!» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі. Тэрмін — з 1 сакавіка 2022 года да 30 чэрвеня 2022 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2022 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

**II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ**

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Са «Звяздою» — спадручней!» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда», — і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт., руб. кап. | Усяго з ПДВ, руб. кап. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Пыласос Samsung VCC4131S3A/XEV (далей — суперпрыз) | 1 | 132,50 | 159,00 |
| 2 | Прас Holt HT-IR-010 (зялёны), (далей — прыз) | 7 | 40,00 | 336,00 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Са «Звяздою» — спадручней!» складае 495,00 (чатырыста дзевяноста пяць) рублёў.

**III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ**

4. Рэкламная гульня «Са «Звяздою» — спадручней!» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2022 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2022 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 1 сакавіка 2022 года да 12 красавіка 2022 года выразаная з газеты або з дадатковага ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 1 сакавіка да 12 красавіка 2022 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі Установе пасля 14 красавіка 2022 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

**IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ**

9. Для правядзення Гульні Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі.

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Ганцарэвіч Святлана Міхайлаўна — загадчык аддзела рэалізацыі рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Брашко Алег Мікалаевіч — загадчык адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

**V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦАМ**

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 15 красавіка 2022 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 прызоў (па адным для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або члены Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 26 красавіка 2022 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 26 красавіка 2022 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

**VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ**

16. Умовай выдачы прызоў і суперпрыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2022 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза або суперпрыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза або суперпрыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2022 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз або суперпрыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2022 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза або суперпрыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы і суперпрыз выдаюцца пераможцам у тэрмін да 30 чэрвеня 2022 года ў памяшканні Установы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00, з панядзелка да суботы (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам гульні па тэлефонах (017) 271-81-53, 311-17-40, для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза або суперпрыза, Установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаюцца.

20. Пасля 30 чэрвеня 2022 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

**VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаныя з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Са «Звяздою» — спадручней!» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваныя сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефонах: (017) 271-81-53, 311-17-40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4159 ад 24.02.2022 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Храмы маёй радзімы

# «ПЕТРАПАЎЛАЎКА» — МОЙ ЯКАР З МІНУЛАГА

**ВЫХОДЖУ з нетраў станцыі метро «Няміга», перасякаю пад мастом вуліцу і аказваюся побач са знаёмай брамкай. Залаціста-белы ў стылі барока будынак XVII стагоддзя з чырвоным дахам не надта падобны да класічнага храма — хутчэй нагадвае ён самавіты купецкі дом. Ды гэта і нядзіўна. Сабор святых апосталаў Пятра і Паўла быў узведзены на грошы мінскіх гараджан, большасць з якіх належала да купецкага саслоўя. І толькі дзве вежкі, увянчаныя зіхатлівымі праваслаўнымі крыжамі, якія выглядаюць так, нібыта іх дабудавалі ў самы апошні момант, згадаўшы пра сапраўднае прызначэнне будынка, не даюць памыліцца: перад намі — менавіта храм. Прычым самы старэйшы з тых, якія захаваліся ў Мінску з мінулых часоў.**

Паводле старадаўніх традыцый, ніводны будынак не мог быць вышэйшым за царкоўны шпіль. Дамінаванне над храмам, Домам Бога, — справа грахоўная, яскравае сведчанне чалавечай ганарыстасці. І я з сумам гляджу на Петрапаўлаўскі сабор, літаральна заціснуты сёння паміж сучаснымі шматпавярховікамі з навіслымі над вуліцай лоджыямі, яркімі магазіннымі вітрынамі, аўтамабільнымі паркоўкамі і вынесенымі на вуліцу столікамі кавярняў.

Але тут я міжволі згадваю прыпавесць, якую некалі пачула ад майго духоўніка. Гэта быў аповед пра згублены нацельны крыжык. Крыжык упаў з парванага ланцужка на зямлю, у кучу смецця, і некалькі стагоддзяў ляжаў там, страчаны і ўсімі забыты. Але аднойчы, пракладаючы новую дарогу, людзі



знайшлі яго і, разумеючы сапраўдную каштоўнасць гэтай рэчы як артэфакта даўніны і сімвала веры, аднеслі ў найбліжэйшы храм. І крыжык быў урачыста змешчаны каля галоўнай храмавай святыні — абраза Маці Божай.

Не проста так, пэўна, здарылася, што Петрапаўлаўскі сабор перажыў стагоддзі, напоўненыя войнамі, паўстаннямі, рэвалюцыямі і рознымі іншымі катаклізмамі. І няхай сёння ён выглядае паміж шматпавярховымі глыбамі сучасных дамоў як згублены нацельны крыжык сярод смецця, я веру, прыйдзе час сапраўднай рэстаўрацыі пачуццяў, і на гэтай вуліцы сабор, крыжамі сваімі скіраваны ў Нябёсы, зноў будзе самым высокім будынкам.

Я памятаю «Петрапаўлаўку» яшчэ з савецкіх часоў. Студэнтка, што прыехала ў сталіцу з правінцыі вучыцца на факультэце журналістыкі, я глядзела тады на свет шырока расплюшчанымі, здзіўленымі вачыма. Мінск падаваўся незвычайна прыгожым, хоць і нязвыкла-чужым. Але аднойчы, гуляючы па цэнтры сталіцы, я наблізілася да зачыненага для вернікаў храма, на сцяне якога красавалася шыльда пра тое, што дадзены археалагічны помнік ахоўваецца дзяржавай. Тут знаходзіўся гарадскі архіў. Але недзе ўнутры сябе ў той час я нібыта адчула глухі ўдар старадаўняга царкоўнага звона. Ці, можа, тое быў удар майго сэрца, якое хацела, каб я затрымалася каля гэтых сцен... Гэткі стан прынята называць іншаземным словам «дэжавю», але насамрэч, думаю, гэта праява генетычнай памяці. Прайшлі гады, і я выпадкова даведалася пра тое, што Петрапаўлаўскі сабор мае дачыненне да маіх продкаў. І што гісторыя нашага роду, якую я ведала толькі са слоў бацькі, больш багатая на падзеі...

## З КУПЕЦКАГА РОДУ

Год, у які Гасподзь паклікаў да сябе майго бацьку, выдаўся яблычным. Плады цягнулі да зямлі галіны старых яблынь у двары Інстытута анкалогіі, і бацька, гледзячы на іх з акна сваёй палаты, цяжка ўздыхаў: «У мяне на дачным участку яблынька ўпершыню будзе пладаносіць, а я — тут»... У апошні час яго, былога афіцэра савецкай Арміі, усё больш цягнула да зямлі. Ён адчуваў незвычайную асалоду, удыхаючы мядовы пах веснавой глебы альбо прэлы водар восеньскай лістоты. Зямля беларуская, нібыта каханая жанчына, вабіла, прыцягвала, выклікала слёзы замілавання і словы шчырых прызнанняў у любові ў чалавека, які амаль усё жыццё лічыў сябе на Беларусі нетутэйшым.

Толькі перад самай смерцю ён услед за мною ўпэўніўся, што памыляўся, лічачы сябе карэнным расіянінам. Ды і сапраўды, што мог ведаць аб далёкіх продках сваіх выхаванец суvораўскага ваеннага вучылішча, які з цяжкасцю прыгадваў нават імя прадзеда!

Мой бацька, Масляніцын Аляксандр Аляксандравіч, быў ваенны сірата. Нарадзіўся ў старажытным Ніжнім Ноўгарадзе, у тыя часы горадзе Горкім. Маці яго, Таццяна з роду Патапавых, была вясковай жанчынай. Бацька, гараджанін, цясляр, таксама Аляксандр Аляксандравіч, хадзіў па вёсках у пошуку падпрацоўкі. Здавалася, што і продкі іх заўжды жылі гэтак жа,



Сабор св. Пятра і Паўла, г. Мінск

па-пралетарску. Аднак нехта са сваякоў настойліва сцвярджаў: Масляніцыны за царом былі купцамі. Не надта важнымі, не надта ўдалымі. Яны скаціліся да ўзроўню беднасці яшчэ да рэвалюцыі. Магчыма, гэта пазней і выратавала ім жыццё.

Вайна забрала майго дзеда тады, калі бацьку было толькі шэсць гадоў. Бабулі дзед, відаць, не шмат падрабязнасцяў пра свой род распавядаў. Час быў такі. Пра дзеда бацька ведаў наогул мала. Верагодна, гэты чалавек быў веруючым, бо ў сям'і дапускаў знаходжанне іконы. І гэта пры тым, што бабуля мая Таццяна ўпершыню завітала ў царкву толькі падчас вайны, калі дзеда прызвалі на фронт. Яна не ўмела нават маліцца, і ад свайго малодшага сына, майго бацькі, утойвала на ўсякі выпадак, што ён быў хрышчаны па волі дзеда. Бацька даведаўся пра тое ўжо ў сталым узросце ад старэйшай сястры, Веры. Усяго іх у сям'і было трое — Вера, Барыс і Аляксандр. Дарэчы, бабуля Таццяна нядоўга заставалася верніцай. Прыйшла на дзеда «пахаванка», і яна ў адчаі выкінула з дома ікону — «Няма Бога, калі не абараніў мужа!» Быццам бы ікона тая не знікла — сваякі не далі, і пасля зноў вярнулася на сцяну, аднак за ўчынак свой бабуля панесла пакаранне. Яна паволі ўцягнулася ў моцныя напоі. Я памятаю яе жанчынай за 60 гадоў з абвіслым тварам, для якой самай вялікай радасцю ў жыцці было трапіць на чыёсьці вяселле ці юбілей, дзе «ракой цячэ гарэлачка»...

«Мы — рускія, мы — з самых нізоў, каб не савецкая ўлада, пэўна, былі б нават непісьменнымі», — у гэтым бацька быў упэўнены. І калі я раптам на схіле яго жыцця расказала яму рэальную гісторыю нашага роду, быў уражаны звыш меры, бо цяжка, неверагодна цяжка згадзіцца ў душы на змену перакананняў.

## ХРАМ І МЛЫНЫ

Прозвішча наша — Масляніцыны — з тыпова рускім канчаткам. Яно мусіла гучаць спачатку як Масленіцы, або Маслянкі (менавіта так называецца народнае свята Масленіца па-беларуску). Зусім нечакана да маіх пошукаў далучыўся вядомы мінскі археолаг Пятро Русаў. Ён сказаў, што сапраўды такі род — купецкі — на Беларусі існаваў. І не проста дзесьці, а ў Мінску.

У сярэднявечных дакументах, якія захаваліся ў нашым гістарычным архіве, ёсць нямала ўпамінанняў пра мінскіх гараджан Маслянак. Адзін з іх — купец Андрэй Іванавіч, пэўны час выконваў абавязкі мінскага бургамістра. Праваслаўны і глыбока веруючы чалавек, разам з жонкай сваёй Марыяй Філіпаўнай ён шмат ахвяраваў на храмы і манастыры. Мемарыяльныя пліты з іх імёнамі ўмураваныя ў заходнюю сцяну Петрапаўлаўскага сабора.

Сапраўдным рыцарам праваслаўя быў таксама больш малады прадстаўнік роду — Васіль Андрэевіч Маслянка, магчыма, ён даводзіўся бургамістру Маслянку сынам. Гэты чалавек дабіўся ад караля Жыгімонта III Вазы спецыяльнага прывілея на пабудову на ўласнай зямлі на рэках Свіслачы і Пярэспе двух млыноў, частка даходу ад дзейнасці якіх мусіла ісці на патрэбы Мінскага шпітальнага брацтва. І гэта быў не проста ўчынак, гэта быў своеасаблівы подзвіг чалавека ў імя сваёй веры.



Насамрэч, кароль Жыгімонт III Ваза, заўзяты католік, выхаванец езуітаў, выношваў планы прымусовага акаталічвання ўсіх сваіх падданых, якія дагэтуль католікамі не былі. Пасля трэба было чакаць і ўсеагульнага апалячвання. Першым крокам у дадзеным накірунку стала заключэнне ў 1596 годзе Берасцейскай царкоўнай уніі. Заяўлялася, што саюз розных хрысціянскіх канфесій узмоцніць краіну. Але аказалася інакш. Праваслаўным, якія згадзіліся на ўнію, з усіх адзнак іх веры пакінулі толькі мову богаслужэнняў. Уніяцкія храмы (ранейшыя праваслаўныя цэрквы) мусілі ператварыцца ў нейкі прыдатак да касцёлаў. Каталіцызм жа абвясцілі дзяржаўнай рэлігіяй.

Трэба адразу сказаць, што далёка не ўсе праваслаўныя згадзіліся на такія ўмовы саюзу. А іх лідары — духоўныя і свецкія асобы — нават пакінулі Берасце, калі даведаліся пра ўсе акалічнасці ўніі. У выніку распачаліся ганенні за веру.

Вышэйшыя дзяржаўныя пасады для праваслаўных былі забароненыя, амаль немагчыма стала трапіць у магістрат. Даводзілася толькі згадваць тыя часы, калі кіраўніком у горадзе быў Андрэй Маслянка. Цяпер яго адзінаверцам ужо не выдавалі дазволаў на занятак тым ці іншым відам рамяства і нават гандлем. А ў рамеснікаў і купцоў, якія ўжо мелі такія дазволы, іх нярэдка адбіралі. Каталіцкае і ўніяцкае духавенства нахабна захоплівала зямельныя ўладанні праваслаўных манастыроў, самі манастыры і храмы. Але ніхто не мог забараніць багатым сем'ям будаваць на ўласных землях дамавыя цэрквы, і гэтым скарысталіся мінскія праваслаўныя. Яны заявілі пра стварэнне Шпітальнага брацтва, якое зоймецца лячэннем хворых гараджан і будзе дзейнічаць на базе царквы ў гонар апосталаў Пятра і Паўла.

Царкву пачалі будаваць у 1611 годзе на зямлі, якую падарыла брацтву княгіня-падзвіжніца Еўдакія Сцяцкевіч. 52 праваслаўныя мінскія сям'і сталі заснавальнікамі і ахвяравальнікамі Петрапаўлаўскага храма, шпіталя, а пасля і мужчынскага манастыра, які крыху пазней узнік там жа (манахі прынялі на сябе галоўны клопат пра шпітальных пацыентаў). Брацтва дарэмна дабівалася ад магістрата, у якім у гэты час ужо не было іх адзінаверцаў, дазволу на пабудову для ўласных патрэб млына. Праблему вырашыў у 1619 годзе Васіль Маслянка. Невядома як, але яму ўдалося атрымаць дазвол на млынарскую дзейнасць ад караля, і млыны запрацавалі, прыносячы прыбытак не толькі сям'і самога прадпрымальніка, але і Петрапаўлаўскаму брацтву. Ці варта здзіўляцца, што яшчэ адзін з Маслянкаў стаў святаром Петрапаўлаўскай царквы...

Нашчадкі маіх продкаў, купцоў Маслянкаў, пакінулі Мінск у сярэдзіне XVII стагоддзя, падчас казацкай вайны Багдана Хмяльніцкага. Яны падтрымалі казакоў, у якіх бачылі змагароў за веру, і пасля вымушаныя былі ратавацца ад непазбежнай расплаты. Адзін з іх займаўся тым, што перавозіў па рэках грузы. На яго судне сямейства Маслянкаў і скіравалася ў далёкі шлях да невядомага. Аселі яны, у рэшце рэшт, на Волзе, у горадзе Ніжнім Ноўгарадзе...

Ці было заканамерным неасэнсаванае вяртанне на Беларусь майго бацькі, аднаго з іх нашчадкаў? Я не ведаю адказу на гэтае пытанне, як не ведаю пакуль што іншых імёнаў маіх продкаў Маслянкаў. Але чарговы раз апынаючыся каля сцен Петрапаўлаўскага сабора, міжволі распраўляю плечы. Гэта мой якар з мінулага, гэта мой храм. Гэта храм маіх нашчадкаў.

**Ірына МАСЛЯНІЦЫНА.**

# ЛЁС МУЗЕЯ

## Дык колькі гадоў Нацыянальнаму гістарычнаму?

**Гэтае пытанне ўзнімаецца ўжо не першы год. Але дакладнай фіксаванай даты, ад якой можна было б весці адлік гісторыі Нацыянальнага гістарычнага музея, пакуль няма. Выставачны праект «Лёс Музея — Лёс Краіны. Шлях даўжынёй у стагоддзе» якраз мае на мэце звярнуць увагу грамадскасці на дадзеную праблему. Тым больш што цяпер на ўзроўні дзяржавы трэба вырашаць задачы, звязаныя з пашырэннем плошчаў аднаго з галоўных захавальнікаў гістарычнай памяці, з размяшчэннем экспазіцый і падачай матэрыялу. Дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Аляксандр ХРАМЫ выказаў спадзяванне, на канферэнцыі, якая запланавана на кастрычнік, будзе пастаўлена кропка ў пытанні і прапанавана дата, што трэба зацвердзіць на самым высокім узроўні.**

**Вядучы навуковы супрацоўнік аддзела фондаў, адзін з куратараў выстаўкі Наталля МАРТЫНАВА** заўважыла, што больш за 20 гадоў вядзецца работа з архівамі і фондамі. Вызначаць адпаведную дату можна па двух крытэрыях. Першы звязаны з заснаваннем найстарэйшых калекцый. Тут можна было б адштурхвацца ад 1908 года, калі ў Мінску быў створаны Царкоўны гісторыка-археалагічны музей. Яго калекцыі пасля ўвайшлі ў склад дзяржаўнага музея. Дарэчы, царкоўны музей існаваў нядоўга. Пачалася Першая сусветная вайна, у 1915 годзе ён быў эвакуіраваны ў глыбінку Расійскай імперыі, у Разань.

Другі крытэрый для вызначэння дня нараджэння ўстановы — з'яўленне структуры, а гэта ўжо канец 1918-га — пачатак 1919 гг. Захаваўся дакумент ад 20 студзеня 1919 года, прадстаўлены на выстаўцы, дзе згадваецца музей як ужо існуючая структура, — пратакол пасяджэння ўрада Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь. Прыведзеная ў ім назва «абласны музей» пацвярджае, што ўстанова створана да 1919 года, бо тады нашу тэрыторыю акрэслівалі як «Заходнюю вобласць».

Установа, якая стваралася як галоўны музей краіны, перажыла савецка-польскую вайну, аднак зборы былі страчаны. Але за кароткі час музейшчыкі паспелі паказаць, чаго вартая іх праца. Адзін з першых дырэктараў музея Леў Замкоў у 1919 годзе накіраваўся ў Нясвіж, дзе займаўся аховай архітэктурнага комплексу і скарбаў, якія ў ім былі.

Пасля Рыжскага дагавора, калі Мінск быў вызвалены, музейшчыкі звяртаюцца да ўрада з просьбай вярнуць з Разані калекцыю царкоўнага музея. Дакументы, што захаваліся ў архівах, пацвярджаюць, што ў 1922 годзе рарытэты амаль цалкам былі прывезены, вёўся прыём прадметаў.

Са жніўня 1923-га музей атрымлівае новую назву — Беларускі Дзяржаўны Музей (БДМ). Менавіта так, усе тры словы з вялікай літары. У тыя часы місія музейшчыкаў лічылася ганаровай, пачэснай, супрацоўнікі называліся служачымі. Ды і сёння яны схільныя казаць, што служаць у музеі.

### ЗБІРАЛЬНІКІ

— Выстаўка прысвечана гісторыі музея. У першую чаргу чалавечай годнасці, асобам, якія яго стваралі, — заўважае Наталля Мартынава. — У нас у музеі людзі служаць па 20, 40, 50 гадоў. Як разумееце, гэта не самая прыбытковая прафесія. Паклон маім калегам, што збіраюць і вывучаюць, дзякуючы якім краіна атрымлівае магчымасць захаваць сваю гістарычную памяць.

Звычайна музейшчыкі хаваюць ад людскіх вачэй інвентарныя нумары і шыфры, якімі пазначаюцца прадметы. Асаблівасць жа новага праекта ў тым, што такія запісы таксама выкарыстаны для стварэння экспазіцыі, бо па іх можна прасачыць гісторыю прадметаў.

Выстаўка зроблена на аснове архіўных даных і даследаванняў захавальнікаў калекцый гістарычнага музея. Побач з рарытэтамі, якія збіраліся ў даваенныя гады (а таксама ў 1950-я, калі музей аднаўляўся пасля Вялікай Айчыннай), прадстаўлены архіўныя дакументы, публікацыі.

Вывучэнне калекцыі — няпростая праца. Часам на тое, каб правесці атрыбуцыю аднаго прадмета, сыходзяць гады. Неабходна вывучаць літаратуру, мемуары, працаваць з аналагамі ў іншых музеях. Так, самы першы прадмет нават не мае штампа царкоўнага музея, але захавалася запіска, на якой пазначана, што гэта падарунак музею. Сярод спадчыны царкоўнага музея — не толькі сакральныя рэчы: яго стваральнікі шырэй вывучалі гісторыю Беларусі, пачалі збіраць этнаграфічную калекцыю, закупалі беларускія касцюмы. Менавіта прадметы з царкоўнага музея — адны з самых каштоўных, некаторыя з гэтых рарытэтаў можна ўбачыць на выстаўцы «Лёс Музея — Лёс Краіны». У вітрынах — адзіны з абразоў, пра які дакладна вядома, што ён быў сярод экспанатаў, эвакуіраваных з царкоўнага музея ў 1915 годзе. Прадстаўлены на выстаўцы таксама копіі і арыгінальныя дакументы са знакамітага Трайчанскага збору. Гэта архіў Слуцкага Свята-Троіцкага манастыра. Захавалася амаль тысяча дакументаў, пачынаючы з 1517 года і да пачатку XIX стагоддзя.



Фота БелТА.

У 1920-я гады, час, калі ідзе беларусізацыя, музей мае профіль навуковай установы, актыўна фарміруюцца калекцыі. Добрая доля артэфактаў была сабрана падчас шматлікіх экспедыцый. У экспазіцыі сёння прадстаўлены прадметы з розных даваенных калекцый,— этнаграфія, жывапіс, а таксама рэчы з даваеннага аддзела саматужнай прамысловасці (тады актыўна развівалася рамесніцтва). Асобная вітрына аддадзена пад калекцыю разных драўляных коўшыкаў канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Дарэчы, у ёй больш за 50 адзінак. Асобныя вітрыны знаёмяць з прадметамі з археалагічнага аддзела.

1920-я — перыяд, які падарыў музею выдатных даследчыкаў, было наладжана супрацоўніцтва з Інбелкультам, ладзіліся шматлікія экспедыцыі, выстаўкі. У музеі працавалі Філіповіч, Кругер, Ластоўскі, Ляўданскі. У якасці супрацоўніка музея Янкель Кругель едзе ў этнаграфічныя экспедыцыі ў Слуцк. У час падарожжа робіць акварэльную замалёўку касцёла Святога Антонія, якую перадае ў музей. Гэта адно з першых паступленняў у мастацкую калекцыю ўстановы. Фактычным жа стваральнікам паўнавартаснага мастацкага аддзела стаў Міхаіл Філіповіч. Працаваў тут і мастак-рэстаўратар (адзін з першых, хто ўзнаўляў Мінскі цудатворны абраз) Гаўрыла Віер, захаваліся зробленыя ім партрэты прыбіральшчыцы і загадчыка гаспадаркі музея. Дарэчы, у 1930-я гады на базе мастацкага аддзела пачынае ствараццa мастацкая галерэя.

Выстаўка расказвае, як мяняўся падыход да падачы інфармацыі ў 1930-я гады. Менавіта тады ўстанову крытыкавалі за тое, што ў ёй падаецца «контррэвалюцыйная нацдэмаўская гістарычная канцэпцыя». Многія супрацоўнікі трапілі пад рэпрэсіі, сярод іх дырэктары музея Ластоўскі і Рак-Міхайлоўскі. Змяніліся задачы па фарміраванні калекцыі, тэматыка экспазіцыйных залаў, інтэрпрэтацыя. Некаторыя аддзелы былі знішчаны, прадметы — размеркаваны па тэмах «капіталізм», «феадалізм».

У гады Вялікай Айчыннай вайны калекцыі беларускага музея былі вывезены ў Германію. Палова з іх не вернута да гэтага часу. Частка калекцый была перададзена іншым музеям, у тым ліку Мастацкаму.

У 1957 годзе пачынае дзейнічаць арганізацыйная група па адраджэнні ўстановы. У пошуках экспанатаў зноў ладзяцца шматлікія падарожжы па Беларусі і не толькі, друкуюцца звароты да грамадзян з просьбай перадаваць рэчы. Паступае спадчына з расфарміраванага ў Вільні музея імя Івана Луцкевіча.

Савет Міністраў прымае рашэнне аб узвядзенні новага будынка ў сталіцы — побач з Палацам прафсаюзаў — для гісторыка-краязнаўчага музея. Сюды перавозяцца фонды, супрацоўнікі плануюць выстаўкі. Але ў хуткім часе напярэдадні юбілею Перамогі будынак перадаецца Музею гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. А Гістарычны музей перамяшчаецца на ягонае месца — на вуліцу Карла Маркса.

# ЖЫВЫЯ КАРТЫ

## Дзяцей беларусам «прыносіў» не толькі бусел

**У нашай краіне вядзецца работа па стварэнні Беларускага фальклорна-этналінгвістычнага атласа. Гэтае ўнікальнае выданне дазволіць больш даведацца пра культуру і традыцыі, светаўспрыманне нашага народа, убачыць, на якіх тэрыторыях пашыраныя пэўныя ўяўленні. Акрамя таго, калі новыя карты суадносіць з раней створанымі археалагічнымі, гістарычнымі, моўнымі крыніцамі, можна атрымаць новыя даныя пра рассяленне плямёнаў, пра кантакты паміж жыхарамі пэўных тэрыторый і пра тое, як маглі ўзнікаць, распаўсюджвацца і змяняцца творы фальклору, пэўныя абрады, сюжэты, міфы.**

За доўгія гады экспедыцый у архіве Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі назбіралася багата фальклорных запісаў з розных куткоў краіны. Экспедыцыі працягваюцца і сёння, і свежыя адкрыцці таксама ўлічваюцца пры распрацоўцы картаў. Атлас дазволіць сістэматызаваць назапашаны матэрыял па традыцыйнай духоўнай культуры і стане своеасаблівым дапаможнікам для даследчыкаў і людзей, якія цікавяцца культурнай спадчынай нашага народа.

Днямі прайшоў круглы стол, прысвечаны работы над згаданым выданнем. Даследчыкі раскрылі асобныя сакрэты нашых продкаў, закладзеныя ў атлас. Напрыклад, ён падкажа, як нашы продкі адказвалі на пытанне «адкуль бяруцца дзеці». Сабрана больш за 800 запісаў, якія прапаноўваюць розныя варыянты. Так, беларусы маглі сказаць, што немаўля знайшлі не толькі ў капусце, але і ў бульбе, хлебным полі, у лесе. Малога мог прынесці сваяк ці чужы чалавек, цыган, ведзьма, звяры ці нават рыба, альбо малое ўзялі з вады, рэчкі, у калодзежы. Натуральна, нашым продкам дзіця таксама маглі прыносіць бусел або варона. Часам у вёсках казалі, што птушкі раскопвалі дзіця... у гноі. На тэрыторыі цэнтральнага і заходняга Палесся маглі «пахваліцца», што малое выдзеўблі з пня, калоды. А яшчэ быццам дзяцей «куплялі».

Млечны Шлях у традыцыйных уяўленнях часцей за ўсё асацыяваўся з дарогай, па якой розныя пералётныя птушкі выпраўляюцца ў вырай, альбо шляхам сакральных персанажаў (Бога, праведных святых, вучняў Хрыста) ці «кірункам» да Кіева, Іерусаліма, святога горада. На поўдні краіны вяскоўцы маглі сказаць, што гэта «чумацкі» шлях (па якім вазілі соль).

Фантазіяй продкаў можна толькі захапляцца. Так, у Евангеллі ад Матфея ўцёкам Святой сям'і ў Егіпет прысвечаны толькі два радкі. А ў вуснай традыцыі гэтая гісторыя абрасла цікавымі дэталямі. Жывёліны і расліны, якія аказвалі дапамогу ці адмаўляліся рабіць яе, набывалі пэўныя ўласцівасці. Напрыклад, асіна дрыжыць, бо аказалася баязлівай і не ратавала, а вось елку, калі яна ўпрыгожаная, нельга выкідваць (можна толькі спаліць), бо яна хавала Святую сям'ю. Уласна, таму яе галінкі цяпер нахіленыя ўніз, а раней быццам раслі ўверх, і яна магла скідваць лісце, як іншыя дрэвы...

У картах будзе багата іншых фальклорных асаблівасцяў, яны могуць стаць карыснымі крыніцамі звестак для гісторыкаў, лінгвістаў, краязнаўцаў, экскурсаводаў.

Старонку падрыхтавала Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Белгипроторг»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Имущество согласно списку № 1: https://docs.google.com/document/d/1lJrCB6oNF8Sixl8hsgkrP3xlhNs1GyhP/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 220,20 | 22,02 | 11,01 |
| 2 | Имущество согласно списку № 2: https://docs.google.com/document/d/1Dt7ha5hvzSvBuvywB67OP3jiRdTWYd4-/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 200,40 | 20,04 | 10,02 |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся третьи повторные торги. Цена снижена на 50 % в отношении лотов №№ 1 и 2. Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 3 (29625) от 06.01.2022, 23 стр., № 231 (29600) от 30.11.2021, 6 стр., № 16 (29638) от 26.01.2022, 6 стр.

Местонахождение лотов: 220089, г. Минск, ул. Железнодорожная, д. 31, корпус 1, комн. 307

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **16 марта 2022 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **С 10.00 01 марта 2022 года по 16.00 14 марта 2022 года** |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту ___, ОАО «Белгипроторг», проводимых 16.03.2022.
2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах, копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта; копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7,5 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов **– Андрей, +375293042560.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Белгипроторг» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375293489225 (220089, г. Минск, ул. Железнодорожная, д. 31, корпус 1, ком. 307, УНП 100026596)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ о созыве годового за 2021 г. общего собрания акционеров

## ОАО «УКХ «БелГАЗавтосервис»

**Собрание состоится 30.03.2022 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 25Б, к. 318.**

Собрание проводится по инициативе и решению Совета директоров общества.
Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 10.40 до 11.00.

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Отчет генерального директора о результатах деятельности ОАО «УКХ «БелГАЗавтосервис» за 2021 год и основные направления развития Общества на 2022 год.
2. Отчет и заключение ревизионной комиссии ОАО «УКХ «БелГАЗавтосервис» о результатах деятельности за 2021 год.
3. Об аудите Общества по результатам финансово-хозяйственной деятельности ОАО «УКХ «БелГАЗавтосервис» за 2021 год.
4. Об утверждении годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2021 год.
5. Распределение чистой прибыли за 2021 год.
6. О выплате дивидендов за 2021 год.
7. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи в 2021 г.
8. О порядке распределения чистой прибыли ОАО «УКХ «БелГАЗавтосервис» на 2022 г.
9. Об избрании членов Совета директоров ОАО «УКХ «БелГАЗавтосервис».
10. Об избрании ревизионной комиссии ОАО «УКХ «БелГАЗавтосервис».

С информацией касающейся вопросов, включенных в повестку дня, лица, имеющие право на участие в общем собрании, могут ознакомиться с 28 по 29 марта 2022 года в рабочие дни с 10.00 по 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 25Б, комн. 313, а в день проведения собрания – во время и в месте его проведения.

Участникам собрания для регистрации необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий их личность, представителям акционера – также надлежащим образом оформленную доверенность.

УНП 100123046

## Открытое акционерное общество «СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 4»

**сообщает, что 31 марта 2022 года в 15.00 состоится годовое общее собрание акционеров в актовом зале по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17**

**Повестка дня**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2021 год и основных направлениях развития Общества на 2022 год.
2. О работе наблюдательного совета в 2021 году.
3. О результатах проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2021 год.
4. О результатах аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2021 год. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2021 год.
5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2021 год. О выплате дивидендов за 2021 год.
6. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, на 2022 год и первый квартал 2023 года. Периодичность выплаты дивидендов за 2022 год.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. Об утверждении Устава Общества в новой редакции.
10. Утверждение локальных правовых актов ОАО «СТРОЙТРЕСТ № 4».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 10 марта по 30 марта 2022 года по месту нахождения Общества: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17 каб. 209 с 9.00 до 16.00, 31 марта 2022 года – по месту проведения собрания с 09.00 до 14.00.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет проводится 31 марта 2022 года с 14.00 до 14.45.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 10 марта 2022 года.

Для регистрации на участие в собрании акционеру Общества необходимо иметь – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

**Телефон для справок: +375 17 334 33 64.**

***Наблюдательный совет.***

УНП 100055368

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** | |
| **Продавец** | **ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38. Тел. + 375 29 688-04-88** | |
| **Предмет аукциона** | | |
| **Лот № 1** Местоположение **– г. Минск, ул. Замковая, 33** | | |
| **Офисная мебель и оргтехника в составе 437 единиц:** ПЭВМ, коммутаторы, кондиционеры, счетчики банкнот, копировальные аппараты, пожарная сигнализация, источники бесперебойного питания, компьютерная сеть, система симметричной связи, счетно-денеж. машинки, мебель, кабельная телефонная линия, системы вентиляции и кодиционирования воздуха, сейфы, комплекты перегородок, аппарат нагрева-охлаждения воды, рольшторы (полный перечень см. на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**) | | |
| **Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 128 681,28 бел. руб.** (снижена на 30 %) **Шаг аукциона – 6 434,06 бел. руб.** | | |
| **Лот № 2** Местоположение **– г. Минск, ул. Лилии Карастояновой, 32-19** | | |
| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
| **Помещение санитарно-бытового назначения** | 1,7 кв. м | 500/D-7028275 |
| **Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 3 108,00 бел. руб.** (снижена на 30 %) **Шаг аукциона – 155,40 бел. руб.** | | |
| **Лот № 3 Местоположение – г. Минск, ул. Замковая, д. 33-6** | | |
| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
| **Административно-торговое помещение** | 733,5 кв. м | 500/D-7023833 |
| **Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 1 624 560,00 бел. руб.** (снижена на 30 %) **Шаг аукциона – 81 228,00 бел. руб.** | | |
| **Лот № 4** Местоположение **– г. Минск, ул. Замковая, д. 33-1а** | | |
| **Кабинеты** (административное помещение) | 87,9 кв. м | 500/D-708041778 |
| Составные части и принадлежности: открытая автостоянка пл. 523 кв. м | | |
| **Начальная цена лота № 4 (с НДС 20 %) – 289 800,00 бел. руб.** (снижена на 30 %) **Шаг аукциона – 14 490,00 бел. руб.** | | |
| ***Сведения о земельном участке по лотам № 3 и № 4:*** пл. **0,1469 га** предоставлен продавцу на праве общего долевого постоянного пользования (доля: 17/50) для эксплуатации и обслуживания административного здания с магазином. ***Ограничения (обременения) прав:*** после продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа: ООО «ИПМ-Консалт оценка» | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета аукциона:** предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) рабочих дней** со дня проведения аукциона | | |
| **Порядок ознакомления:** в рабочие дня по предварительному согласованию, тел. +375 (29) 680-80-99 (Шубко Юлия Владимировна) | | |
| **Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне представляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by** | | |
| В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 % | | |
| Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона, исчисляемое в процентном соотношении от цены продажи (4 % – по лотам № 1, 2; 2 % – по лоту № 3, 3 % – по лоту № 4) в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона | | |
| Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликованы в газете «Звязда» от 05.02.2022 | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **16.03.2022 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» | |
| **Дата и время начала и окончания приема заявлений** | **С 09.00 01.03.2022 до 17.00 14.03.2022** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» | |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@ipmconsult.by**

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управление механизации № 91»

**Лот № 1:** административное помещение с инв. № 500/D-708004811, 39,9 кв. м, адрес: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 7.

Изолированное помещение расположено в капитальном строении, которое является памятником историко-культурного наследия.

Начальная цена с НДС – 187 188,05 руб.
Задаток – 18 718,81 руб. Шаг аукциона – 5 %.

**Аукцион состоится 12.03.2022 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – **10.03.2022 в 11.00.**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## ИНФОРМАЦИЯ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор аукциона:**
Мядельский сельисполком, тел.: (801797) 40735, 22352.

**День и время проведения аукциона:**
**24 марта 2022 г. в 14.00**

**Место проведения аукциона:**
Минская обл., г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, к. 15.

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Гатовичи,**

РИЗ «Гатовичи», У-9, пл. 0,132 га,
кадастровый номер 624083103601000326,
начальная цена – 39000 бел. руб.

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Минского областного исполнительного комитета **www.minsk-region.gov.by** (http://minsk-region.gov.by/dlya_delovykh_lyudey/auktsiony/), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by** (http://gki.gov.by/ru/auction/).

УНП 600380436.

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управление механизации № 91» (Продавец)

**Лот № 1:** гидравлический автомобильный грузовой специальный кран KATO NK-450S на шасси Mitsubishi K503, регистрационный знак KA4522, заводской / кузов (рама) № CT-45176S / 20678. Начальная цена с НДС – 46 026,00 руб. Задаток – 4 602,60 руб. Шаг аукциона – 1 %.

**Лот № 2:** автомобиль PEUGEOT 406, 1997 г. в. Начальная цена с НДС – 2 760,00 руб. Задаток – 276,00 руб. Шаг аукциона – 10 %.

**Лот № 3:** автомобиль VOLKSWAGEN TRANSPORTER, 1998 г. в. Начальная цена с НДС – 5 160,00 руб. Задаток – 516,00 руб. Шаг аукциона – 10 %.

**Местонахождение лотов №№ 1–3:** г. Минск, ул. Бабушкина, д. 17.

**Аукцион состоится 23.03.2022 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – **21.03.2022 в 11.00**.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

# «АПАЛА ЗОРКА, І НА МІГ ЗДАЛОСЯ МНЕ, ШТО ГЭТА ТЫ...»

## Як беларускія пісьменнікі прызнаваліся ў каханні

**Вясна ў любую, самую трывожную, эпоху асацыіруецца з каханнем. Чыстым, пяшчотным, першым... У кожнага паэта і пісьменніка ёсць падобны сюжэт у творах, і ва ўсіх такіх сюжэтах ёсць хоць бы частка асабістага досведу аўтара. Бо кожнаму ж даводзілася калісьці прызнавацца ў каханні... Давайце ўспомнім некаторыя такія прызнанні з беларускай літаратуры.**

### МАРЫЎ ПРА ДАЧУШКУ АД КАХАНАЙ

Пра жанчын у жыцці Максіма Багдановіча напісана шмат... Першым жа яго юнацкім каханнем лічыцца Ганна Рафаілаўна Какуева, сястра Максімавых таварышаў па Яраслаўскай гімназіі. «Ах, как умеете Вы, Анна, не замечать, что я влюблен...» Малады паэт прысвяціў ёй шмат сваіх шэдэўраў, у тым ліку цыкл «Мадонны» з дзвюх паэм, «У вёсцы» і «Вераніка».



Ганна Рафаілаўна Какуева.

Багдановіч быў частым госцем у гасцінным доме Какуевых, дзе моладзь бавіла час за музыкай, дэкламаваннем вершаў ці гульнёй у гарадкі і лапту. Прыгажуня Ганна вабіла вока... Нават на сваім дзіцячым здымку, які знаходзіўся ў доме. І ў Максіма, які рана страціў маці, нараджаецца самае дзіўнае прызнанне ў каханні:

*«Больш за ўсё на свеце жадаю я,*
*Каб у мяне быў свой дзіцёнак —*
*Маленькая дачушка-немаўляшка,*
*Аня Максімаўна, такая прыгожанькая,*
*Цёпленькая, мокранькая,*
*З чорнымі валосікамі і броўкамі,*
*З цёмна-карымі вочкамі,*
*А ручкі, як перацягнутыя ніткамі.*
*Зусім такая, як Вы,*
*Калі Вы былі маленькай дзяўчынкай».*

Ганна Какуева паступіла ў кансерваторыю ў Пецярбургу, потым выйшла замуж за аднакласніка Максіма... Яе сын Мікалай Лілееў прыязджаў у Мінск на канферэнцыю, прысвечаную Багдановічу. Аня Максімаўна Багдановіч на свет так і не з'явілася, застаўшыся светлым прывідам з гісторыі беларускай літаратуры.

### ЁН ПРЫНЁС РУЖЫ ПАД АБСТРЭЛАМ

У 1919 годзе адзін з рэдактараў «Звязды» Вільгельм Кнорын запрасіў на работу Максіма Гарэцкага. Потым рэдакцыя пераехала ў Вільню... Кола беларусаў, якія працавалі на адраджэнне нацыянальнай культуры, традыцыйна было цесным. Там Гарэцкі і пачуў пра маладую настаўніцу беларускай гімназіі Леанілу Чарняўскую, якая напісала зборнік твораў для дзяцей «Дзіцячыя гульні» і тады працавала над дзіцячай чытанкай.

Гарэцкі прыйшоў да Леанілы на Вастрабрамскую, дзе яна жыла... Гэта было каханне з першага погляду. Брат Максіма Гарэцкага Гаўрыла так апісваў Леанілу: «Была



Максім Гарэцкі з сям'ёй.

яна вельмі прыгожая, з вялікімі сінімі-сінімі вачыма, якія свяціліся розумам, добразычлівасцю, прыхільнасцю, дабрынёю, спагадаю. Голас быў глыбокі, грудны, меладычны. Постаць зграбная, стройная. Каса пышная. Рухі павольныя, плаўныя. Беларуская мова чыстая, напеўная. Леаніла Чарняўская была выключна ласкавая, уважлівая, далікатная».

Прызнаннем у каханні сталі ружы. Прычым пісьменнік насіў іх на Вастрабрамскую пад кулямі — ішла Першая сусветная... Кветкі тыя відавочна былі для творцы сімвалічнымі — нездарма напісаную ў 1922 годзе драму ён назваў «Чырвоныя ружы». І ў дзень, калі з'явіўся да Леанілы з прапановай рукі і сэрца, у двары гэтак жа свісталі кулі, а ў руках закаханага свяціўся букет руж.

16 ліпеня 1919 года Леаніла і Максім павянчаліся. Наперадзе было шмат шчасця і гора...

«Няма таго срэбра ядранай ночы, калі п'янілі галаву пышныя, сочныя, росныя ружы і стукала сэрца ад яе пагляду любага, глыбокага, даўгога і нешта важнае гаворачага...»

### НАПІСАЎ ВЕРШ, ЗА ЯКІ БЫЎ РАСКРЫТЫКАВАНЫ

Гадоў пятнаццаць таму архівіст Віталь Скалабан знайшоў два невядомыя вершы Максіма Танка. Іх перадала Марыяна Мадорава, дачка вядомага рускага мастака Фёдара Мадорава.

Гісторыя гэтых вершаў такая... Падчас вайны Максім Танк нейкі час жыў у Максве, наведваў ЦК КП(б)Б, дзе сакратаром працавала юная прыгажуня Марыяна Мадорава. Танк быў жанаты, але жонка знаходзілася далёка, у эвакуацыі. Адносіны паміж юнай Марыянай і беларускім паэтам утварыліся, як сцвярджала Марыяна Фёдараўна, платанічныя, але з вялікай узаемнай сімпатыяй: «Самым благородным, самым близким, самым надежным человеком в моей жизни был Максим». На шмуцтытуле кнігі Генрыха Мана 8 кастрычніка 1942 года Максім Танк пакінуў верш:

*«Мар'яне.*
*Ты папрасіла напісаць*
*Хоць пару слоў табе на памяць.*
*Ды словы ўсе агнём гараць:*
*На мармур кінь — яго апаляць,*
*Як апалілі сэрца мне...*
*А ты ўсё роўна не паверыш,*
*Што, нат і ў роднай старане,*
*Дзень без Цябе — днём будзе шэрым...»*

Аўтограф другога верша, прысвечанага Марыяне Мадоравай, яна атрымала на аркушыку з вучнёўскага сшытка:

*«Апала зорка, і на міг*
*Здалося мне, што гэта ты*
*Сярод сузор'яў залатых*
*Мільгнула у трыснік густы.*
*Я ў човен кінуў два вяслы,*
*Бярэмя снасцяў рыбака,*
*І, ўзняўшы ветразі, паплыў*
*Цябе і клікаць, і шукаць.*
*Але на гладзі вадзяной,*
*Аж па крутыя берагі,*
*Убачыў я перад сабой*
*Адны кругі, адны кругі».*

Марыяна Фёдараўна была ўпэўнена, што і гэты верш ніколі не друкаваўся. Але ён быў надрукаваны ў 1946 годзе ў № 7 часопіса «Беларусь», толькі без прысвячэння. І якраз трапіў пад прэс у сувязі з сумнавядомай пастановай ЦК ВКП(б) «О журналах «Звезда» и «Ленинград». Пачалі шукаць песімізм, упадніцтва і безыдэйнасць. Якуб Колас мусіў падпісацца пад артыкулам, надрукаваным у газеце «Літаратура і мастацтва» за 7 снежня 1946 года: «Вось верш Максіма Танка «Апала зорка»... Нотка безнадзейнасці, песімізму і ўпадніцтва гучыць у гэтым вершы. А нам гэтага не трэба; мы ў пачатку вялікай дарогі аднаўлення, перад намі шырокія далі. У нас ёсць сілы прыйсці да гэтых даляў, і няма нам падставы ўпадаць у безнадзейнасць».

Марыяна Мадорава выйшла замуж за генерала Патапава, які перажыў фашысцкі палон. Максім Танк уз'яднаўся з жонкай, Любоўю Асаевіч, з якой пражыў разам 56 гадоў.

### СЦЯРПЕЎ АПЁК КІПЕНЕМ

Паэт Аркадзь Куляшоў быў вундэркіндам. Ужо ў пятнаццаць меў у творчым багажы паэтычны зборнік, а таксама верш «Алеся», які стаў папулярнай песняй. Але пра тую Алесю столькі ўжо напісана, паўтараць не будзем... А ўспомнім, як юны Куляшоў, які пераехаў у Мінск, прыйшоў у госці да Платона Галавача. Галавач быў жанаты з Нінай Вечар, прыгожай слухачанкай. У той час у іх жыла сястра Ніны, Аксана. Дзяўчына таксама неверагоднай прыгажосці. Аркадзь пачаў заляцацца... Аксана ішла з імбрыкам з кіпенем... Ну і ў адказ на заляцанні плеснула юнаму кавалеру на нагу. Той адскочыў:



Аляксей Зарыцкі, Аркадзь Куляшоў і Аксана Вечар.

— Вар'ятка!

Але заляцанні не перарваў. Праўда, заваяваць прыгажуню было нялёгка. Як успамінала дачка Куляшова Валянціна, Аксана была старэйшай за Аркадзя і нядаўна разышлася са сваім грамадзянскім мужам Віктарам Нямірам. Той здрадзіў, а калі Аксана, даведаўшыся, вырашыла сысці, прыставіў да яе скроні пісталет: «Заб'ю!». Але тая не пабаялася, спакойна адвяла руку з пісталетам: «Я тут не застануся, і ты мяне не заб'еш»... Куляшоў быў упарты. А калі ўсё ж дайшло да прапановы рукі і сэрца — папярэдзіў: ніколі і нішто — ні каханне, ні сям'я, ні дзеці — не будуць для яго больш важным, чым яго праца, і што ні дзеля чаго жыццёвага ён не пойдзе на кампраміс з паэзіяй, бо «адчувае ў сабе талент, які лічыць неабходным рэалізаваць».

Падчас вайны Аксана Куляшова аказалася з двума дзецьмі ў эвакуацыі... Куляшоў доўга не мог даведацца, дзе сям'я. І вось што ўспамінала Валянціна Куляшова:

«Што ж да бацькі, дык ён быў такі шчаслівы, адшукаўшы сям'ю, што факту перапіскі з жонкай прысвяціў нават верш «Галубкі», напісаны з нагоды смешнага непаразумення. Неяк, калі да бацькі на перадавую прынеслі пошту і ён даведаўся, што яму «не пішуць», затое пішуць нейкаму невядомаму, бацька без вагання папрасіў, каб гэты ліст без адрасата аддалі яму, бо ён чакае ліст ад сваёй жонкі. Бацька не памыліўся — ліст быў да яго. А верш «Галубкі» — вось ён:

*«Не сустрэліся ні разу*
*мы з табою за вайну,*
*А твае лісты з маімі*
*стрэчу мелі не адну.*
*Кожны раз на паўдарозе*
*сустракаюцца яны:*
*на вайну твой ліст імкнецца,*
*мой спяшаецца з вайны.*
*Праз дажджы ляцяць, праз буры,*
*Быццам тыя галубкі,*
*Не залежацца на пошце*
*Нецярплівыя радкі.*
*Толькі кінь лісток у скрыню,*
*Ён сваёй дарозе рад,*
*Дойдзе, знойдзе, не загіне,*
*Жыў бы толькі адрасат.*
*Так да нас лісты прывыклі,*
*хоць без адраса пусці,*
*Усё роўна ліст, як голуб, —*
*не саб'еш яго з пуці...»*

### СТВАРЫЎ ФАЛЬШЫВЫ ДЗЁННІК

Іван Шамякін са сваёй будучай жонкай, Машай Кротавай, вучыўся ў адным класе. Калі абое паступілі вучыцца ў Гомель, каханне расцвіло па-новаму: «І раптам абпякло мяне — цуд! Прайшло два з палавінай гады, а я адразу пазнаў яе, падрослую, папрыгажэлую, не такую ўжо рыжую, у яркай крамнай сукенцы ў зялёны гарошак. Сэрца чамусьці пусцілася ў галоп».

Івану Шамякіну было ўсяго пятнаццаць гадоў. Як ён прызнаваўся, «з маёй закаханасцю звязана мая першая спроба пісаць прозу. На зімовых канікулах, седзячы ў лесе, у самотнай адзіноце, я сачыніў, менавіта сачыніў, дзённік. Выдумаў рамантычную гісторыю: маладая прыгожая жонка ляснічага (не было такой жонкі, была кабета сярэдніх гадоў з трыма дзецьмі, якую бачыў я ўлетку, калі адносіў нейкія паперы бацькавы) закахалася ў мяне (во герой!). Безумоўна, па просьбе яе ляснічы запрасіў мяне, студэнта, інтэлігента, на абед. І абед быў — як у раманах, я не ведаў, які відэлец, нож. Даўгі высокаінтэлігентны дыялог старонак на дзесяць. Размова пра жыццё і пра кнігі, у тым ліку і пра «Что делать?»

Наіўная гісторыя сачынялася для Машы, каб узняць, як кажуць сёння, свой імідж у яе вачах: во які я герой! На мяне нават замужняя жанчына кінула вока! Праўда, доўга вагаўся: паказваць ці не паказваць сваё сачыненне. Падрыхтаваў яе вусна і потым паказаў запаветны сшытак. На чарговым спатканні яна маўчала, і я ад нецярпення чапляўся нагамі за гнілыя дошкі тратуара.



Іван Шамякін з жонкай Марыяй Філатаўнай.

— Прачытала?

— Прачытала.

— І што?

Маша характэрна зморшчылася, прыплюснуўшы свае шырокія, што азёры, вочы.

— Цалаваўся ты з ёй?

— Ну што ты! За каго ты мяне лічыш! Я ўвесь час думаў пра цябе.

— Манюка ты.

— Ты не верыш мне?

— Веру, веру...

Але бачыў, адчуваў, што Маша іранізуе, вельмі тонка. Пасля, праз паўтара года, яна з вясёлым смехам прызналася, што не паверыла ніводнаму слову з таго, што было ў тым дзённіку. Больш такіх дзённікаў я не пісаў. Занатоўваў толькі праўдзівыя падзеі і думкі».

### АДДАЎ ЁЙ СВАЮ ФУТБОЛКУ

У аповесці Уладзіміра Караткевіча «Лісце каштанаў», якую ўсе даследчыкі лічаць у вялікай ступені аўтабіяграфічнай, распавядаецца пра каханне падлеткаў, чыё дзяцінства прыйшлося на вайну. Васілька Стасевіч сустракае Нонку Юніцкую, «дзяўчо год пятнаццаці. Схілілася, пачэсваючы вельмі доўгія, падрапаныя ногі шакаладнага колеру, пасля пацерла каленкам аб каленка, ускінула галаву — чорнабурыя валасы цяжкай хваляй шыбанулі назад — і ўсміхнулася мне, і я ўбачыў цёмна-сінія вочы з ненатуральна велічэзнымі, па-вар'яцку вясёлымі чорнымі зрэнкамі».

Узнікае першае, светлае і чыстае, пачуццё... І вось як герой яго выказвае:

«На горад спускалася сутонне. Апошнія залацістыя адбіткі клаліся на муры дамоў. Вокны таямніча міргалі насустрач захаду: нібы тлелі, згасалі і зноў тлелі ў гусцеючым прысмерку тысячы жаўтавата-зялёных кашэчых зрэнак. З паркаў па правым баку пачало павяваць вільготнай прахаладай. Танюткі галасок нейкай птушкі далятаў адтуль, нібы настойліва і журботна скардзіўся на нешта.

— Ціў-ціў-ціў-ці-і-іуў.

Я даткнуўся да яе рукі і адчуў, што яна пайшла гусінай скурай, адчуў нават, што валосікі ля лакцявых сугібаў натапырыліся ад холаду. І страшэннае шкадаванне ахапіла мяне... Я зняў з сябе футболку.

— Чакай.

Калі яна ўзняла рукі, нібы здаючыся, а я пачаў надзяваць на яе маю выгаралую, мабыць, здорава прапыленую транціну, калі я міжволі кранаўся яе рук і, прасоўваючы галаву, правёў рукамі па чорна-бурых цяжкіх валасах, па плячах, па спіне — пачуццё найглыбейшага замілавання і шчасця ахапіла мяне з такою сілай, што я ледзь не заплакаў».

Для Караткевіча гэта вельмі істотна: ён неадночы нагадваў, што беларусы кажуць не «я яе кахаю», а «я яе шкадую». Пісьменнік бачыў у гэтым народную мудрасць. Літаратуразнаўцы пакуль не высветлілі, хто быў прататыпам Нонкі Юніцкай, але сыходзяцца на тым, што прататып рэальны. У лісце ад 5 лютага 1957 года да сябра Юрыя Гальперына Караткевіч прызнаецца: «Я дважды любил взаимно — одна уехала. Другая умерла». Мяркуючы, што тая, што з'ехала — і была Нонка...

Прызнавайцеся ж у каханні пабеларуску!

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «Счастливый случай. 5 сезон. Тур 1»

**1. Сведения об организаторе.**

Частное торговое унитарное предприятие «ЗападХимТорг» (далее – Организатор). УНП 590828925. Зарегистрировано приказом начальника главного управления юстиции Гродненского областного исполнительного комитета от 16.01.2008 г. № 2-р. Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 590828925.

Местонахождение Организатора: 221335, Гродненская обл., Ивьевский р-н, аг. Липнишки, ул. Виленская, д. 12А, корп. 1, комн. 6.

Почтовый адрес: 220100, г. Минск, ул. Кульман, д. 35А, пом. 8

**2. Наименование Рекламной игры.**

«**Счастливый случай. 5 сезон. Тур 1**».

**3. Территория проведения.**

Магазины «Остров чистоты», «Остров чистоты и вкуса» на территории Республики Беларусь и интернет-магазины ostrov-shop.by, zht.by, zhs.by, zhi.by.

**4. Сроки проведения.**

03.03.2022 – 20.05.2022 (включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения Рекламной игры).

**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.**

Председатель:

1. Смаль Арина Олеговна, ЧТУП «ЗападХимТорг», заместитель директора по маркетингу и рекламе.

Члены комиссии:

1. Стасюк Евгений Владимирович, ЧТУП «ЗападХимТорг», начальник отдела рекламы.
2. Гулак Анна Владимировна, ЧТУП «ЗападХимТорг», специалист по маркетингу.
3. Щука Анна Николаевна, ООО «ЗападХимИнвест», дизайнер.
4. Приявко Оксана Федотовна, ООО «Торговая компания Ромакс», маркетолог.

**6. Перечень продукции, участвующей в Игре.**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования продаж продукции торговых марок LUXVISAGE, OLD SPICE, COLGATE, FAIRY, ULKER, SCHAUMA, указанной в Приложении 1 (далее – товары-счастливчики), реализуемых в магазинах «Остров чистоты», «Остров чистоты и вкуса» и интернет-магазинах ostrov-shop.by, zht.by; zhs.by; zhi.by.

**7. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Рекламной игры.**

Участниками Рекламной игры могут стать физические лица – граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь, достигшие 18 лет, выполнившие условия участия в Рекламной игре.

К участию в Рекламной игре не допускаются члены комиссии.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

Для участия в Игре необходимо в период с 03.03.2022 по 30.03.2022 включительно:

1. совершить покупку товаров-счастливчиков на сумму не менее 10,00 (десять) белорусских рублей в любом магазине «Остров чистоты» или «Остров чистоты и вкуса» или на сайте интернет-магазинов ostrov-shop.by; zht.by; zhs.by; zhi.by, с использованием при расчете за покупку дисконтную карту «Остров чистоты и вкуса», «Остров чистоты».

Покупатели, осуществляющие расчет за товар на кассе торгового объекта «Остров чистоты» или «Остров чистоты и вкуса» с использованием карт рассрочек («Халва», «Карта покупок», «Карта Fun» и др.), не могут быть участниками Рекламной игры, так как дисконтная карта не может быть применена при расчете картами рассрочек в соответствии с программой лояльности «Остров чистоты», «Остров чистоты и вкуса»;

2. достоверно заполнить персональные данные в личном кабинете на сайте ostrov-shop.by (далее – Интернет-сайт) в день совершения покупки (или до момента оформления заказа через интернет-магазины ostrov-shop.by, zht.by, zhs.by, zhi.by) и подтвердить согласие на участие в Рекламной игре на Интернет-сайте (либо проверить корректность ранее заполненных данных), а именно:

- фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (если такое имеется);
- дата рождения (обязательно);
- адрес проживания, пребывания в Республике Беларусь: область (обязательно), район (обязательно), населенный пункт (обязательно), улица (обязательно, при наличии), дом (обязательно), корпус (обязательно при наличии), номер квартиры (обязательно, при наличии);
- адрес электронной почты (обязательно);
- абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи участника в международном формате (обязательно);
- оператор сотовой связи A1, МТС, life:) (обязательно).

В случае если согласие на участие в рекламных мероприятиях было подтверждено ранее, повторное подтверждение не требуется;

3. в личном кабинете на Интернет-сайте дать согласие на обработку персональных данных (при отказе от дачи согласия либо в последующем отзыве согласия участие в Рекламной игре аннулируется) для использования в целях, связанных с проведением Рекламной игры.

Игровые коды присваиваются с первого разряда (0000001, 0000002, 0000003 и т. д.) автоматически по порядку.

Участник получает один Игровой код за покупку товаров-счастливчиков на сумму не менее 10 (десять) белорусских рублей в чеке при покупке в торговых объектах «Остров чистоты» или «Остров чистоты и вкуса», на сайте интернет-магазинов ostrov-shop.by; zht.by; zhs.by; zhi.by (например, за покупку товаров-счастливчиков на сумму 70 (семьдесят) белорусских рублей в чеке участник получает семь Игровых кодов).

Каждому покупателю, который впервые совершил действия, указанные в пп. 1 и пп. 2 п. 7 настоящих Правил, присваивается следующий после последнего присвоенного Игровой код на дату и время регистрации на Интернет-сайте.

Каждому покупателю, который совершил повторные действия, указанные в пп.1 настоящих Правил (и который прошел прежде регистрацию на Интернет-сайте согласно пп. 2 п. 7), присваивается порядковый Игровой код по дате и времени покупки.

Присвоенные Игровые коды отображаются в диалоговом окне личного кабинета Интернет-сайта в течение 5 (пяти) суток после присвоения.

Каждый участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии соблюдения установленных условий Рекламной игры.

**8. Состав и размер призового фонда.**
**Источники формирования.**

Источником формирования призового фонда является имущество и денежные средства Организатора. Общий размер призового фонда составляет: 79 636,20 (семьдесят девять тысяч шестьсот тридцать шесть) рублей двадцать копеек и включает следующие призы:

| № п/п | Наименование | Кол-во, шт. | Стоимость за ед., бел. руб | Всего стоимость за ед., бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Денежный приз в размере 20 000 белорусских рублей и денежное вознаграждение | 1 | 20000,00 | 20000,00 |
| | | 1 | 2964,45 | 2964,45 |
| 2 | Ноутбук Apple MacBook Air13-inch M1Model A2337 MGN63RU/A (Страна производства – Китай) 1-30-TT2513455.0139RB/2022 и денежное вознаграждение | 5 | 3544,98 | 17724,90 |
| | | 5 | 505,65 | 2528,25 |
| 3 | Смартфон APPLE iPhone 13 256GB Pink, Model A2635 MLP53RK/A (Страна производства – Китай) 1-30-TT2513315.0075RB/2022 и денежное вознаграждение | 5 | 3426,36 | 17131,80 |
| | | 5 | 487,93 | 2439,65 |
| 4 | Кофемашина PHILIPS EP3246 (EP3246/70) (Страна производства – Румыния) 195592-0214, 1477/2021 и денежное вознаграждение | 5 | 1500,18 | 7500,90 |
| | | 5 | 200,11 | 1000,55 |
| 5 | Кухонный комбайн Bosch MUM5XW20 CNUM51S (Страна производства – Словения) 710460-10-1071, 1359/2021 и денежное вознаграждение | 5 | 991,98 | 4959,90 |
| | | 5 | 124,17 | 620,85 |
| 6 | Отпариватель для одежды Tefal IT3450E0 (Страна производства – Китай) 93154064-4168, 1164/2021 и денежное вознаграждение | 1 | 324.96 | 324,96 |
| | | 1 | 24,50 | 24,50 |
| 7 | Отпариватель для одежды Tefal IT3450E0 (Страна производства – Китай) 93154064-6643, 1350/2021 и денежное вознаграждение | 4 | 324,96 | 1299,84 |
| | | 4 | 24,50 | 98,00 |
| 8 | Новая Яндекс. Станция Мини YNDX-00021 YNDX-0021K (Страна производства – Китай) 0403-ПД1404404,0230RB/2022 и денежное вознаграждение | 5 | 198,00 | 990,00 |
| | | 5 | 5,53 | 27,65 |

**9. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших участников Рекламной игры.**

Розыгрыш призов состоится 06 апреля 2022 года в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. Кульман, 35А, 7-й этаж, комната переговоров.

**9.1. Порядок проведения розыгрыша.**

К моменту проведения розыгрыша Организатором формируется список Игровых кодов по возрастанию, сформированный согласно п. 7 настоящих Правил, с указанием фамилии, имени, отчества (при наличии) Участников, номера дисконтной карты, даты подтверждения согласия на участие в Рекламной игре, даты и времени совершения покупки. Игровые коды имеют одинаковую разрядность.

Для проведения розыгрыша используется лототрон, состоящий из 7 секций, каждая из которых соответствует определенному разряду Игрового кода, и несколько наборов шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 до 9. Определение выигрышных Игровых кодов получателей призов происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из секций лототрона. Розыгрыш начинается с первого разряда слева.

За ходом розыгрыша призов следит комиссия по проведению Игры. Итоги розыгрыша призов Игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.

Призовой фонд разыгрывается в последовательности, указанной в п. 8 настоящих Правил.

Игровой код победителя, выигравший один из призов, может признаваться выигрышными только один раз. В случае повторного попадания в Игровой код уже выигравший один из призов в розыгрыше выигрышным считается следующий по списку Игровой код.

Если следующий за выигрышным Игровой код принадлежит победителю, выигравшему один из призов, то выигравшим становится следующий после него первый Игровой код иного участника. В случае если Игровой код попадает на конец списка, то выигрышным будет считаться первый Игровой код иного участника с начала списка.

**10. Срок и способ информирования участников, выигравших призы, место, порядок и сроки выдачи призов.**

Участники-победители будут уведомлены о выигрыше посредством почты и телефонного звонка по 14 апреля 2022 года включительно.

Победитель может получить приз лично, предъявляя документ, удостоверяющий личность (паспорт, вид на жительство) или его уполномоченное лицо при предъявлении документов, удостоверяющих его личность и доверенности, полученной и удостоверенной, в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, в офисе Организатора и оригинала дисконтной карты «Остров чистоты и вкуса», «Остров чистоты» по адресу: г. Минск, ул. Кульман, д. 35А, пом. 8, по 20 мая 2022 года с 10.00 до 17.00 в рабочие дни, а также по предварительной договоренности в субботу 30 апреля 2022 года с 12.00 до 14.00.

Организатор удерживает из суммы денежной части призов сумму подоходного налога победителя, в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

В случае отказа победителя от получения приза или неполучения приза в установленные сроки и в установленном порядке победитель теряет право на получение приза, и приз данного победителя остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.

Выплата денежного эквивалента стоимости приза или замена его на другой приз не допускается.

Участники Рекламной игры, претендующие на получение призов, обязуются: заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором, представить Организатору необходимые сведения. В случае невыполнения указанного условия Организатор имеет право отказать в выдаче призов.

Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения и заполняет все необходимые документы, представленные Организатором и связанные с получением приза.

**11. Название печатного средства массовой информации, в котором будут опубликованы результаты розыгрыша призового фонда, а также сроки их опубликования.**

Настоящие правила подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

Результаты проведения Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» по 20 мая 2022 включительно.

**12. Общие условия Рекламной игры.**

Принимая участие в Рекламной игре, участник подтверждает свое ознакомление и согласие с Правилами и со всеми условиями участия в Рекламной игре.

Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Рекламной игры, а также результаты проведения Рекламной игры будут считаться окончательными и будут распространяться на всех участников.

Информацию об условиях участия и проведения Рекламной игры можно получить по телефонам «горячей линии»: +37544 700-13-33, +37533 686-37-37 с 09.00 до 21.00, а также на сайте ostrov-chistoty.by.

**Приложение 1**

| Штрихкод | Товар |
|---|---|
| | Вся продукция торговой марки Luxvisage |
| | Вся продукция торговой марки Old Spice |
| | Вся продукция торговой марки Colgate |
| | Вся продукция торговой марки Fairy |
| 8690504033899 | ULKER Albeni BAR KEK. Шоколадный кекс с жидкой карамелью и мол. шоколадом, 43 г |
| 4870112003925 | ULKER Albeni Bites печенье с карамелью в молочном шоколаде с крошками печенья, 72 г |
| 4870112002768 | ULKER Biskrem печенье с какао кремовой начинкой, 100 г |
| 8690504032069 | ULKER Cokomel печенье покрытое шоколадом с маршмэллоу, 48 г |
| 8690504032076 | ULKER Cokomel печенье покрытое шоколадом с маршмэллоу Клубника, 48 г |
| 8690504065661 | ULKER DANKEK 8 KEK. Кекс с жидкой шоколадной начинкой, 55 г |
| 8690504103394 | ULKER DANKEK Donut. Шоколад. кекс с маршмэлоу в мол. шоколаде, 162 г |
| 8690504008699 | ULKER DORE печенье с кремовой начинкой мол. и белого шоколада, 86 г |
| 4870112003024 | ULKER Halley сэндвич-печенье покрытое мол. шоколадом с маршмэллоу, 30 г |
| 8690504012139 | ULKER HANIMELLER печенье с кусочками шоколада, 82 г |
| 8690504065111 | ULKER Laviva шоколад-бисквит с молочной начинкой, 35 г |
| 8690504082651 | ULKER SAKLIKOY SUTLU KREMALI печенье из цельнозерновой пшеничной муки с молочной начинкой, 100 г |
| 8690504116196 | ULKER SAKLIKOY цельнозерновое печенье с кремом сливочно-лимонный чизкейк, 100 г |
| 8690504116189 | ULKER SAKLIKOY цельнозерновое печенье с кремом сливочно-малиновый чизкейк, 100 г |
| 8690840215324 | ULKER Желейные конфеты Yupo Meter Tutti Frutti, 50 г |
| 8690840215317 | ULKER Желейные конфеты yupo meter кола, 50 г |
| 4015000914161 | Schauma Kids Шампунь 225 мл Для мальчиков |
| 4015100427189 | Schauma Kids Шампунь 350 мл Для девочек |
| 4015100427202 | Schauma Kids Шампунь 350 мл Для мальчиков |
| 4015100291179 | Schauma Kids шампунь и гель для душа 380 мл Нежный и бережный уход для мальчиков |
| 4015100402636 | Schauma Men Шампунь 400 мл Энергия Природы Алое Вера и Минералы |
| 4015100402650 | Schauma Men Шампунь 400 мл Энергия Природы Уголь и Вулканическая глина |
| 4015100330175 | Schauma Маска 380 мл Манго |
| 4015100330151 | Schauma Маска 380 мл Энергия Природы Клубника, Банан и Семена Чиа |
| 4015100193169 | Schauma Бальзам 200 мл 6 Уровней восстановления |
| 4605966003162 | Schauma Бальзам 200 мл 7 Трав |
| 4015001013313 | Schauma Бальзам 200 мл 7 Цветов |
| 4605966014618 | Schauma Бальзам 200 мл Push-Up Объем |
| 4015100291018 | Schauma Бальзам 200 мл для тонких и ослабленных волос VITA-Укрепление |
| 4015001006742 | Schauma Бальзам 200 мл Кристальный блеск |
| 4015100180565 | Schauma Бальзам 200 мл Облепиховый заряд |
| 4015001010480 | Schauma Бальзам 200 мл Объем и свежесть |
| 4053158977768 | Schauma Бальзам 200 мл Сила кератина |
| 4015100306538 | Schauma Бальзам 200 мл Смузи Клубника, Банан и Семена Чиа |
| 4015100199789 | Schauma Бальзам 200 мл Энергия Природы Кокосовая Вода и Цветок Лотоса |
| 4015100336887 | Schauma Бальзам 200 мл Энергия Природы Манго |
| 4015100193091 | Schauma Бальзам 200 мл Энергия Природы Медовый Эликсир и Масло Инжира |
| 4015100193114 | Schauma Бальзам 200 мл Энергия Природы Свежая Крапива и Зеленое яблоко |
| 4015100325188 | Schauma Сухой шампунь 150 мл для нормальных волос |
| 4605966003223 | Schauma Шампунь 225 мл 7 трав |
| 4605966014595 | Schauma Шампунь 225 мл Push-Up Объем |
| 4605966003254 | Schauma Шампунь 225 мл Для мужчин |
| 4015100180589 | Schauma Шампунь 225 мл ОБЛЕПИХОВЫЙ ЗАРЯД |
| 4053158977737 | Schauma Шампунь 225 мл Сила Кератина |
| 4015100193176 | Schauma Шампунь 380 мл 6 Уровней Восстановления |
| 4605966003032 | Schauma Шампунь 380 мл 7 трав |
| 4053158945170 | Schauma Шампунь 380 мл Fresh it Up! |
| 4605966014601 | Schauma Шампунь 380 мл Push-up Объем |
| 4015100451153 | Schauma Шампунь 380 мл Баня |
| 4015000937061 | Schauma Шампунь 380 мл Для волос и тела |
| 4605966003063 | Schauma Шампунь 380 мл Для мужчин |
| 4015100291940 | Schauma Шампунь 380 мл для тонких и ослабленных волос VITA-Укрепление |
| 4015000993845 | Schauma Шампунь 380 мл Лемонграсс |
| 4015100180664 | Schauma Шампунь 380 мл ОБЛЕПИХОВЫЙ ЗАРЯД |
| 4015001010459 | Schauma Шампунь 380 мл ОБЪЕМ И СВЕЖЕСТЬ |
| 4605966014427 | Schauma Шампунь 380 мл от перхоти Intensive |
| 4015100195040 | Schauma Шампунь 380 мл Против перхоти Сила Кофеина |
| 4015100195033 | Schauma Шампунь 380 мл Против перхоти с Молочком Миндаля |
| 4015000949088 | Schauma Шампунь 380 мл Свежесть мяты |
| 4015000942867 | Schauma Шампунь 380 мл Свежесть хлопка |
| 4015100186611 | Schauma Шампунь 380 мл Сила карбона 5 |
| 4053158977720 | Schauma Шампунь 380 мл Сила Кератина |
| 4015000981828 | Schauma Шампунь 380 мл Спорт |
| 4015100306453 | Schauma Шампунь 400 мл Смузи Клубника, Банан и Семена Чиа |
| 4015100306491 | Schauma Шампунь 400 мл Энергия Природы Киви и Огурец |
| 4015100193107 | Schauma Шампунь 400 мл Энергия Природы Клюква и Дикий шиповник |
| 4015100199826 | Schauma Шампунь 400 мл Энергия Природы Кокосовая Вода и Цветок Лотоса |
| 4015100336900 | Schauma Шампунь 400 мл Энергия Природы Манго |
| 4015100193084 | Schauma Шампунь 400 мл Энергия Природы Медовый Эликсир и Масло Инжира |
| 4015100193077 | Schauma Шампунь 400 мл Энергия Природы Прованские травы и Лаванда |
| 4015100193121 | Schauma Шампунь 400 мл Энергия Природы Свежая Крапива и Зеленое яблоко |
| 4015100185430 | Schauma Шампунь 750 мл 7 трав |
| 4015100207729 | Schauma Шампунь 750 мл Для Всей Семьи |
| 4015100185478 | Schauma Шампунь 750 мл Для мужчин |
| 4015100451177 | Schauma Шампунь + гель для душа 750 мл Баня |

*Свидетельство № 4150 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 9 февраля 2022 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

# КАБ УРАДЖАЙ УРАДЗІЎ

## «ЗУБРАНЯ» НА ГРАДЦЫ

***— Андрэй Іванавіч, што сёння вырошчваецца ў нашай краіне ў прамысловым агародніцтве і ў агародніцтве непрафесійным? Ці вялікая розніца ў выбары агароднінных культур для вырошчвання, напрыклад, фермерамі і дачнікамі?***

— Спецыфіка вытворчасці агародніны ў Беларусі ў тым, што прыкладна дзве трэці ўсіх аб'ёмаў агароднінай прадукцыі вырошчвае насельніцтва на прысядзібных і дачных участках. І толькі адна трэць вырабляецца ў прафесійным агародніцтве (сельгасарганізацыямі і сялянска-фермерскімі гаспадаркамі). Фермерамі ў адкрытым грунце вырошчваюцца чатыры культуры, якія займаюць 96—98 % аб'ёмаў іх вытворчасці — гэта **капуста**, **буракі**, **морква** і **цыбуля**. На астатнія 2-4 працэнты прыпадаюць у тым ліку **таматы** і **агуркі**. Сельгасарганізацыі спецыялізуюцца ўжо на шасці культурах: вышэйпералічаныя чатыры ў адкрытым грунце і таматы-агуркі ў зашклёных ацепленых зімовых цяпліцах. На асабістых участках — дачных і прысядзібных — спектр агароднінных культур значна шырэйшы. У прамысловым агародніцтве многія з гэтых культур не вырошчваюцца, таму што яны дрэнна паддаюцца механізацыі і не захоўваюцца так доўга, як так званая група баршчовага набору. Агароднікі робяць упор на часнок, рэзка-араматычныя, зяленіўныя, салатныя культуры, і ў цэлым на ранніх сартах агародніны для ўжывання ў свежым выглядзе. У сувязі з гэтай спецыфікай і пабудавана работа інстытута.

**Паступовае пацяпленне клімату — гэта тэндэнцыя, якая назіраецца ў нашай краіне з 1991 года. За 30 гадоў тэмпература глебы вырасла на некалькі градусаў. І гэта сапраўды ўплывае на агратэхніку і склад культур.**

Паколькі наша задача — у першую чаргу падтрымліваць прамысловае агародніцтва, асноўны ўпор мы робім на селекцыю і распрацоўку тэхналогій вырошчвання тых відаў агародніны, якія неабходныя сельгасарганізацыям. Але ўвесь час ідзе работа і па стварэнні новых сартоў, напрыклад, таматаў, агуркоў. А таксама больш рэдкіх культур, запатрабаваных насельніцтвам. Так, за апошнія 30 гадоў створана 25 сартоў і гібрыдаў тамата, 15 сартоў і гібрыдаў агуркоў, 17 — капусты, 8 сартоў рэпчатай цыбулі, 6 — буракоў і 5 — морквы. У апошнія гады выведзена таксама па адным сорце так званых маларaспаўсюджаных відаў — вострага перцу, фізалісу, хрэну сунічнага, катрану, кропу, цыбулі-парэю, цыбулі-слізуна, шніт-цыбулі, батуна, рэдзькі, лобы, пастарнаку, базіліку, бабоў, календулы лекавай, эхінацэі пурпуровай, чуфы. Гэта ўжо — менавіта для дачнікаў.

***— Давайце вернемся да больш распаўсюджаных культур, што вырошчваюцца на дачах і прысядзібных участках. Якія новыя сарты памідораў, перцу і агуркоў прапануюць беларускія селекцыянеры агароднікам у пачатку гэтага дачнага сезона?***

— Сучасная канцэпцыя сусветнай лагістыкі гародніны дыктуе селекцыянерам пэўныя патрабаванні да новых сартоў. Лагістыка мае на ўвазе збор гародніны недаспелай, выкарыстанне спецыяльных гібрыдаў з высокімі паказчыкамі захавальнасці, часта на шкоду смакавым і пажыўным уласцівасцям. Таму нярэдка можна пачуць, што агародніна з супермаркетаў «пластыкавая» або «гумовая», што яе «немагчыма есці». У нас захаваны зыходны матэрыял — старадаўнія традыцыйныя сарты, і мы вядзём селекцыйную работу менавіта ў напрамку смакавых якасцяў. Калі асноўныя аб'ёмы вырошчвання агародніны — гэта дачныя і прысядзібныя ўчасткі, то людзям не прынцыпова, каб той памідор ці агурок захоўваўся паўгода, ім важнейшы яго смак. З іншага боку, мы не можам знаходзіцца ў баку ад сусветных тэндэнцый, бо ёсць яшчэ прамысловасць, якой патрэбныя сарты і гібрыды, што доўга захоўваюцца. Напрыклад, створаны гібрыд таматаў **«Лежабок»** для плёначных цяпліц летне-восеньскага абароту. Расліны вышынёй два метры, плады чырвоныя, сярэдняга памеру, 90-120 г, захоўваюцца 30-40 сутак. І нават застаючыся на кусце, захоўваюць шчыльнасць мякаці і вонкавы выгляд. Пры гэтым смакавыя якасці таматаў практычна не пацярпелі — мы выкарыстоўвалі гены лёжкасці больш мяккага характару, яны не так моцна пагаршаюць смак. З апошніх напрацовак, дзе ў аснову быў пастаўлены смак таматаў, я назваў бы, напрыклад, гібрыд **«Лапа»** — для аматараў буйных памідораў. Гэта высакаросны гібрыд для плёначных цяпліц, ён устойлівы да мясцовых хвароб. Плады чырвоныя, масай 180-250 г, на кісці 3-5 пладоў, а ўраджайнасць складае да 15 кілаграмаў на квадратны метр. Што датычыцца смакавых якасцяў, яны ацэньваюцца на 4,5—5 балаў па пяцібальнай шкале. З раннеспелых сартоў увагі агароднікаў заслугоўвае гібрыд **«Зубраня»** — ён спее на 3-5 дзён раней за іншыя буйнаплодныя аналагі. «Зубраня» — гібрыд куставога габітусу, гэтыя таматы можна вырошчваць і ў цяпліцах, і ў адкрытым грунце.

З буйнаплодных сартоў перцу створаны гібрыд **«Лада»** — сярэднеспелы, для плёначных цяпліц, плод кубападобнай формы, сярэдняя маса яго — 130-180 г. Перцы сакавітыя і мясістыя: таўшчыня сценкі 6-7 мм, ураджайнасць — 5-6 кг з квадратнага метра. Яшчэ адна цікавая распрацоўка — гібрыд салодкага перцу **«Кінжал»**. Плады жоўта-аранжавыя, даўжынёй каля 20 см, конусападобныя. Сярэдняя маса іх — каля 120 г, ураджайнасць — больш за 5 кг з квадратнага метра.



Па агурках хачу спыніцца на двух новых гібрыдах. Гэта **«Духмяны»**, партэнакарпічны гібрыд карнішоннага тыпу для адкрытага грунту. Адрозніваецца хуткаспеласцю — першыя агурочкі можна збіраць ужо праз 40-45 дзён пасля пасеву. Зялёны плод даўжынёй 8-10 см, універсальнага прызначэння — і на стол, і ў загатоўкі. А таксама гібрыд **«Пачастунак»** — кароткаплодны партэнакарпічны гібрыд для ахаванага грунту, ураджайнасцю 15 кг на квадратны метр. Для загатовак ён не падыдзе, а вось у свежым выглядзе і ў салатах гэтыя агуркі вельмі смачныя. На ранні ўраджай лепш за ўсё вырошчваць рассадным спосабам. Характэрна, што гібрыд устойлівы да мучністай расы і пераноспарозу.

## ДВА ЎРАДЖАІ ЗА СЕЗОН — ГЭТА МАГЧЫМА?

***— Некаторыя дачнікі з недаверам ставяцца да гібрыдаў. Кажуць, што яны патрабавальныя да ўмоў вырошчвання і не даюць магчымасці атрымаць уласнае насенне. Што выбраць для сваіх «сотак» — сорт або гібрыд? І яшчэ адно пытанне: спыніцца на айчыннай селекцыі або аддаць перавагу высокаўраджайным еўрапейскім сартам?***

— Сарты зручнейшыя ў тым плане, што аднойчы купіўшы насенне, дачнік можа ў далейшым атрымліваць пасяўны матэрыял самастойна. Бо дачнікі вырабляюць сартазмену не штогод, а ў сярэднім раз на 3-5 гадоў. З гібрыдамі прыйдзецца працаваць кожны год — весці картатэку ўпадабаных, купляць насенне. Калі казаць аб ураджайнасці, патэнцыял гібрыдаў вышэйшы, і пры стварэнні неабходных умоў гібрыды будуць больш прадукцыйныя, чым сарты. Але ў сорту ёсць патэнцыял адаптавацца да розных нестандартных умоў. І ў любым выпадку пры выкарыстанні сорту можна казаць аб атрыманні мінімальнага гарантаванага ўраджаю. Я параіў бы агароднікам набываць гібрыды для ахаванага грунту і сарты для адкрытага.

Што датычыцца пытання, айчынны або замежны пасяўны матэрыял выбраць, тут трэба ўлічваць наступнае. Айчынныя сарты ствараюцца ў нашых кліматычных умовах, выпрабоўваюцца ў плёначных цяпліцах і ў адкрытым грунце. Яны больш адаптаваныя да мясцовага клімату і да мясцовых рас узбуджальнікаў хвароб у параўнанні з імпартнымі. Можна купіць замежнае насенне, і, магчыма, вам пашанцуе — расліны будуць адчуваць сябе нядрэнна. Але калі браць статыстыку, у сярэднім з сотні замежных сартоў і гібрыдаў у нашых умовах прыжываецца менш за дзясятую частку.

***— Чаму сёння беларускія селекцыянеры так актыўна заняліся салодкім перцам — у сувязі з пацяпленнем клімату? І ў цэлым, як змяняецца звыклы склад агароднінных культур з прычыны таго, што клімат мяняецца?***

— Паступовае пацяпленне клімату — гэта тэндэнцыя, якая назіраецца ў нашай краіне з 1991 года. За 30 гадоў тэмпература глебы вырасла на некалькі градусаў. І гэта сапраўды ўплывае на агратэхніку і склад культур. З аднаго боку, павышаюцца агракліматычныя рэсурсы, з другога, даводзіцца выкарыстоўваць больш засухаўстойлівыя культуры — агароднінную і спаржавую фасолю, бахчавыя, гарбузовыя культуры, кукурузу салодкую.

У сувязі з пацяпленнем клімату сяўба ссоўваецца на больш раннія тэрміны, уборка — на пазнейшыя. То-бок можна выкарыстоўваць сарты больш працяглага вегетацыйнага перыяду. Пры гэтым ёсць традыцыйныя для нашай культуры віды і сарты агародніны, якія ў гэтыя новыя тэрміны вырошчваць становіцца праблематычна. Прыходзіцца высейваць іх у больш раннія тэрміны, калі вільготнасць глебы і паветра, тэмпература аптымальныя для сяўбы. А значыць, і паспяванне надыходзіць трохі раней, чым патрабуецца. І прадукцыя альбо менш захоўваецца ў халодны перыяд, альбо перастойвае на градках — і замест тэхналагічнай спеласці надыходзіць біялагічная. А гэта іншы біяхімічны склад, што таксама адбіваецца на лежкасці. У якасці прыкладу можна ўзяць белакачанную капусту. Яе пазнейшыя сарты трэба ссекчы, калі тэмпература паветра апусцілася ніжэй за +5 градусаў Цэльсія і стабілізавалася на дадзенай адзнацы. У нашы дні гэта лістапад. Каб падгадаць да лістапада, высаджваць расаду варта досыць позна, калі ўжо занадта горача, глеба недастаткова вільготная і трэба акцэнтаваць увагу на паліве. Акрамя таго, у сувязі з пацяпленнем клімату кожны год прыходзяць экстрэмальная спякота і засухі, і без якаснага паліву ўсё больш складана атрымаць ураджай агародніны.

***— Што б вы ў гэтай сувязі параілі агароднікам?***

— Сёння ў крамах прадстаўлены шырокі асартымент паліўных сістэм. Ёсць устаноўкі для кропельнага паліву і для дажджавання, прадстаўлены малыя тэхнічныя рашэнні, і яны не настолькі дарагія, каб дачнік не мог дазволіць іх сабе. Калі мэта — не проста «пакорпацца ў агародзе для душы», а атрымаць ураджай якаснай сакавітай агародніны, без сістэмы паліву цяпер, бадай, не абысціся. Іншы шлях — выбар новых сартоў звыклых культур, больш адаптаваных да тых умоў, якія мы маем. Трэба сказаць, што падбіраць сарты варта пад свой рэгіён — у Віцебскай вобласці, напрыклад, вегетацыйны перыяд пакуль яшчэ не занадта доўгі, а ў паўднёвых абласцях краіны ён ужо разбіваецца на дзве часткі. Пры дапамозе ранніх хуткаспелых сартоў можна атрымаць прадукцыю ў сярэдзіне лета, і потым падабраць сарты і гібрыды, каб увосень сабраць агародніну на захоўванне і загатоўкі. Для захоўвання можна падбіраць такія віды агародніны, як, напрыклад, радыскавыя культуры. На поўдні Беларусі ўжо магчымы другі збор радыскі, дайкона, рэдзькі чорнай і белай, лобы, пекінскай капусты, морквы. Трэці кірунак работы для дачнікаў (калі з нейкіх прычын паліў арганізаваць цяжка) — увядзенне новых, засухаўстойлівых культур. Напрыклад, тых жа бахчавых і гарбузовых. А таксама змена тэхналогій вырошчвання культур — салодкі перац, таматы і баклажаны ў Беларусі ўжо можна расціць у адкрытым грунце. Але тут ёсць свае «падводныя камяні» — у прыватнасці, баклажаны стаяць па смакавых якасцях на першым месцы для каларадскага жука, бульба — на другім. Але засцярогу хімічнымі прэпаратамі на прысядзібных участках я не раіў бы. У сельгасарганізацый і фермераў ёсць магчымасць правесці яе якасна і бяспечна — у іх маюцца спецыялісты з профільнай адукацыяй, ёсць рэгламенты і кантроль якасці. Агароднікам варта засяродзіцца на больш экалагічных метадах засцярогі — ручным зборы насякомых і выкарыстанні нятканага покрыўнага матэрыялу.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – ОАО «АСБ Беларусбанк»

## Наименование объекта продажи – изолированное помещение (назначение – помещение финансового назначения) общей площадью 206 кв. м, расположенное на 1-м этаже 9-этажного многоквартирного жилого дома в г. Бресте, пр-т Машерова, 80-164А

Начальная цена продажи – 391 617,02 рубля (триста девяносто одна тысяча шестьсот семнадцать рублей 02 копейки) с учетом НДС.

Сумма задатка – 3 916,17 рубля (три тысячи девятьсот шестнадцать рублей 17 копеек).

Обязательным условием аукциона является заключение победителем торгов либо единственным участником, изъявившим готовность приобрести реализуемое изолированное помещение, договора по приобретению имущества (основные средства согласно приложению) общей стоимостью 796,80 (семьсот девяносто шесть рублей 80 копеек) с учетом НДС, предназначенного для эксплуатации отчуждаемого объекта недвижимости.

**Открытый аукцион состоится 14.04.2022 в 10.00 по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, актовый зал (9-й этаж).**

Заявление на участие принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45 по 12.04.2022 включительно по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, каб. 409 (тел.: (0162) 277518, (29) 7939576).

